ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

ВЫДАЕЦЦА З 1932 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 6 (2792) • Пятніца, 6 лютага 1976 г. • Цана 8 кап.

„ПАРТЫЯ — РОЗУМ, ГОНАР І СУМЛЕННЕ НАШАЙ ЭПОХІ"

В. Ульянов (Ленін)

XXVIII З'ЕЗД КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ



Мінск, 4 лютага 1976 года. Прэзідыум XXVIII з'езда Камуністычнай партыі Беларусі. Са справаздачным дакладам выступае кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КПБ тав. П. М. Машэраў.

Фота Р. НОВІКАВА і Л. ПАПКОВІЧА.

ДЗЁННІК З'ЕЗДА

У Мінску ў акруговым Доме афіцэраў 4 лютага адкрыўся XXVIII з'езд Камуністычнай партыі Беларусі.

Сярод дэлегатаў з'езда — перадавікі і наватары прамысловасці і сельскай гаспадаркі, работнікі партыйных і савецкіх арганізацый, кіраўнікі і спецыялісты прадпрыемстваў, будоўляў, калгасаў і саўгасаў, дзеячы навукі, культуры і мастацтва рэспублікі, воіны Савецкай Арміі.

10 гадзін. Кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі таварыш П. М. Машэраў па даручэнню ЦК КПБ аб'яўляе XXVIII з'езд Камуністычнай партыі Беларусі адкрытым. У зале чуваць працяглыя апладысменты. Дэлегаты пачынаюць фарміраванне кіруючых органаў з'езда—Прэзідыума, Сакратарыята, Рэдакцыйнай і Мандатнай камісій.

Таварыш П. М. Машэраў паведамляе, што напярэдадні адбылося пасяджэнне савета прадстаўнікоў партыйных арганізацый абласцей. Савет уносіць на разгляд з'езда прапановы па саставу яго кіруючых органаў.

Савет прадстаўнікоў дэлегацый прапануе выбраць Прэзідыум з'езда ў колькасці 45 чалавек. Гэта прапанова прымаецца. Прэзідыум з'езда выбіраецца аднагалосна.

Таварыш П. М. Машэраў уносіць прапанову выбраць ганаровы прэзідыум з'езда ў саставе Палітбюро Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза на чале з Генеральным сакратаром ЦК КПСС таварышам Леанідам Ільічом Брэжневым. Гэта прапанова прымаецца з вялікім уздымам, пад бурныя апладысменты дэлегатаў і гасцей з'езда.

Затым дэлегаты з'езда прымаюць прапановы савета прадстаўнікоў дэлегацый і аднагалосна выбіраюць Сакратарыят, Рэдакцыйную і Мандатную камісіі з'езда.

Пасля выбрання кіруючых органаў зацвярджаецца парадак дня, парадак і рэгламент работы XXVIII з'езда КП Беларусі:

1. **Справаздача Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі — дакладчык першы сакратар ЦК КП Беларусі таварыш Машэраў П. М.**

2. **Справаздача Рэвізійнай камісіі Кампартыі Беларусі — дакладчык старшыня Рэвізійнай камісіі КПБ таварыш Макараў І. М.**

(Заканчэнне на стар. 2).

XXVIII З'ЕЗД КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ

ДЗЁННІК З'ЕЗДА

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1).

3. **Аб праекце ЦК КПСС да XXV з'езда партыі «Асноўныя напрамкі развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1976—1980 гады» — дакладчык Старшыня Савета Міністраў Беларускай ССР таварыш Кісялёў Ц. Я.**

4. **Выбары Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі.**

5. **Выбары Рэвізійнай камісіі Кампартыі Беларусі.**

Старшынствуючы на з'ездзе другі сакратар ЦК КП Беларусі таварыш А. Н. Аксёнаў даў слова для справаздачнага даклада Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі XXVIII з'езду КПБ кандыдату ў члены Палітбюро ЦК КПСС, першаму сакратару ЦК КПБ таварышу П. М. Машэраву.

Справаздачны даклад ЦК КПБ XXVIII з'езду, з якім выступіў таварыш П. М. Машэраў, быў выслухан з вялікай увагай і неаднаразова перапыняўся апладысментамі.

З'езд накіраваў прывітальныя тэлеграмы XXII Маскоўскай гарадской канферэнцыі КПСС і XIV з'езду Камуністычнай партыі Казахстана.

Старшынствуючы паведамляе, што ў адрас XXVIII з'езда Камуністычнай партыі Беларусі паступілі прывітальныя тэлеграмы ад XIV з'езда Камуністычнай партыі Казахстана, XIX з'езда Камуністычнай партыі Узбекістана, ад Цэнтральных Камітэтаў Камуністычных партый Украіны, Грузіі, Туркменістана, Арменіі, Таджыкістана, Азербайджана, Літвы, Латвіі, Эстоніі, ад Іванаўскага абкома КПСС.

На імя з'езда паступілі таксама шматлікія прывітальныя тэлеграмы і пісьмы, у якіх працаўнікі прамысловасці, сельскай гаспадаркі, будаўнічых і транспартных арганізацый, прадпрыемстваў сувязі, гандлю, бытавога абслугоўвання, работнікі навукі, культуры, народнай асветы, аховы здароўя рэспублікі рапартуюць аб вытворчых поспехах, дасягнутых імі за гады дзевятай пяцігодкі, абавязуюцца азнаменаваць XXV з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза новымі працоўнымі перамогамі.

На гэтым ранішняе пасяджэнне з'езда заканчваецца.

На вячэрнім пасяджэнні з'езда старшынствуе член Бюро ЦК КПБ, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР тав. **Ф. А. Сурганаў.**

Быў заслухан справаздачны даклад Рэвізійнай камісіі КПБ, з якім выступіў старшыня Рэвізійнай камісіі КПБ тав. **Макараў І. М.**

Затым дэлегаты пачалі абмеркаванне справаздачнага даклада ЦК Кампартыі Беларусі і справаздачнага даклада Рэвізійнай камісіі КПБ.

У спрэчках выступілі тт. **І. Я. Палякоў** — першы сакратар Мінскага абкома КПБ, **У. А. Мікуліч** — першы сакратар Брэсцкага абкома КПБ, **С. М. Шабашоў**—першы сакратар Віцебскага абкома КПБ, **І. Я. Парфёненка**—матарыст-выпрабавальнік Мінскага маторнага завода.

Дэлегаты заслухалі і аднагалосна зацвердзілі даклад Мандатнай камісіі з'езда, з якім выступіў яе старшыня **І. Ф. Якушаў.**

Пасля даклада Мандатнай камісіі спрэчкі былі прадоўжаны. Выступіла тав. **Л. М. Галаўнёва** — даярка калгаса імя XXII з'езда КПСС Гомельскага раёна, партгрупорг.

Старшынствуючы паведамляе, што ў адрас з'езда паступілі прывітальныя тэлеграмы ад Ленінградскага і Смаленскага абкомаў КПСС, Крымскага абкома КПУ, рапарты працоўных перамог многіх вытворчых калектываў рэспублікі.

На гэтым вячэрняе пасяджэнне з'езда аб'яўляецца закрытым.

Для дэлегатаў і гасцей XXVIII з'езда КПБ у Дзяржаўным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета дадзен канцэрт.

5 лютага XXVIII з'езд Камуністычнай партыі Беларусі працягваў сваю работу. На ранішнім пасяджэнні старшынствуе сакратар ЦК Кампартыі Беларусі таварыш **А. Т. Кузьмін.** Дэлегаты з'езда працягвалі абмяркоўваць справаздачныя даклады ЦК КП Беларусі і Рэвізійнай камісіі КП Беларусі.

У спрэчках выступілі тт. **В. А. Гвоздзеў**—першы сакратар Гомельскага абкома КПБ, **Л. Г. Кляцкоў**—першы сакратар Гродзенскага абкома КПБ, **В. В. Прышчэпчык**—першы сакратар Магілёўскага абкома КПБ, **У. А. Ляпёшкін**—першы сакратар Мінскага гаркома партыі, **М. Н. Полазаў**—старшыня Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў, **М. А. Барысевіч**—прэзідэнт Акадэміі навук БССР.

Выбіраецца камісія па падрыхтоўцы праекта рэзалюцыі XXVIII з'езда КПБ па справаздачнаму дакладу ЦК КП Беларусі.

Пасля перапынку на пасяджэнні з'езда старшынствуе сакратар ЦК Кампартыі Беларусі таварыш **А. А. Смірноў.**

У спрэчках выступілі тт. **А. І. Белякова** — першы сакратар Гродзенскага райкома партыі, **М. С. Кананава**—міністр лёгкай прамысловасці БССР, **П. С. Асіпенкаў**—першы сакратар Наваполацкага гаркома партыі, **М. І. Лагір**—старшыня Камітэта народнага кантролю БССР, **І. М. Дзёмін**—генеральны дырэктар Беларускага аб'яднання па вытворчасці вялікагрузных аўтамабіляў, Герой Сацыялістычнай Працы, **В. А. Казлоў**—міністр сельскай гаспадаркі БССР.

У адрас з'езда паступілі прывітальныя тэлеграмы ад дэлегатаў XXII Маскоўскай гарадской партыйнай канферэнцыі, ад Цэнтральных Камітэтаў Кампартый Кіргізіі і Малдавіі.

Шматлікія прывітальныя пісьмы і рапарты прыслалі калектывы працоўных рэспублікі, у якіх яны цалкам адабраюць і падтрымліваюць унутраную і знешнюю палітыку Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, яе Цэнтральнага Камітэта, Палітбюро на чале з Генеральным сакратаром ЦК КПСС таварышам Леанідам Ільічом Брэжневым, дзякуюць за велізарныя штодзённыя клопаты партыі і дзяржавы аб павышэнні дабрабыту савецкіх людзей, умацаванні эканамічнай і абаронай магутнасці нашай Савецкай Радзімы, выказваюць гарачае імкненне і гатоўнасць і надалей пасляхова выконваць намечаныя партыяй планы развіцця народнай гаспадаркі і культуры.

Вячэрняе пасяджэнне з'езда адкрылася пад старшынствам сакратара ЦК Кампартыі Беларусі таварыша **В. С. Шавялухі.**

У спрэчках выступілі тт. **А. М. Вахцін**—сакратар партыйнага камітэта вытворчага аб'яднання імя У. І. Леніна (г. Мінск), **Ф. А. Сурганаў**—Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, **Максім Танк (Я. І. Скурко)**—старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, **К. Ф. Нікішчанка**—сакратар пярвіннай партыйнай арганізацыі, галоўны аграном саўгаса «Прыбужжа» Брэсцкага раёна, **І. М. Траццяк**—камандуючы войскамі ЧБВА, **В. В. Русак**—каландраважаты Беларускага шыннага камбіната.

Пасля перапынку старшынствуе член Бюро ЦК КПБ, старшыня Белсаўпрофа **М. Н. Полазаў.**

У спрэчках выступілі тт. **К. М. Платонаў**—першы сакратар ЦК ЛКСМБ, **В. І. Каравай**—старшыня калгаса імя Ціміразева Капыльскага раёна, **А. А. Тоўсцік**—старшыня праўлення Саюза журналістаў БССР, рэдактар газеты «Звязда», **Г. І. Бабарыкіна**—настаўніца Ашмянскай сярэдняй школы № 2.

З'езд прымае рашэнне аб спыненні спрэчак па справаздачнаму дакладу ЦК Кампартыі Беларусі і па справаздачнаму дакладу Рэвізійнай камісіі Кампартыі Беларусі.

З заключным словам па справаздачнаму дакладу ЦК КПБ выступіў кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі таварыш **П. М. Машэраў.**

З'езд аднагалосна адобрыў практычную дзейнасць ЦК КПБ і прыняў рэзалюцыю па справаздачнаму дакладу ЦК КП Беларусі, а таксама зацвердзіў справаздачу Рэвізійнай камісіі КП Беларусі.

На гэтым вячэрняе пасяджэнне аб'яўляецца закрытым.

Сёння, 6 лютага, XXVIII з'езд Кампартыі Беларусі працягвае работу.

БЕЛТА.

У зале пасяджэнняў XXVIII з'езда Камуністычнай партыі Беларусі.

Фота Р. НОВІКАВА і Л. ПАПКОВІЧА.

Абавязак кожнага творчага работніка—штодзённа мець дачыненне да працы і жыцця народа, строю яго думак і пачуццяў, да самых высокіх імкненняў і запатрабаванняў савецкіх людзей. Узрастаючыя ў дзесятай пяцігодцы патрабаванні да якаснага боку справы маюць прамыя, непасрэдныя адносіны і да дзейнасці ўсіх атрадаў работнікаў культуры. У якім бы жанры ні адбываўся зварот мастака да злабадзённага матэрыялу, да актуальных пытанняў сучаснасці, ад літаратараў і дзеячаў мастацтваў чакаюць не скараспелых водгукаў, не павярхоўных ілюстрацый, а твораў глыбокай думкі і высокага майстэрства.

П. М. МАШЭРАЎ.

(Са справаздачнага даклада Цэнтральнага Камітэта КПБ XXVIII з'езду Камуністычнай партыі Беларусі).

ГАЛОЎНАЕ— АКТУАЛЬНАСЦЬ

Больш чым месяц у выставачнай зале Магілёўскага аддзялення Саюза мастакоў БССР экспанавалася абласная мастацкая выстаўка, прысвечаная XXV з'езду КПСС.

Увесь савецкі народ рыхтуе ў гэтыя дні працоўныя падарункі форуму камуністаў краіны, і работы, прадстаўленыя тут, з'явіліся творчай справаздачай апошняга года пяцігодкі.

А паказаць было што. Зараз у вобласці плённа працуе каля ста жывапісцаў, графікаў і скульптараў, адзінаццаць з якіх — члены Саюза мастакоў рэспублікі.

Жывапісныя палотны, графічныя лісты, акварэлі, скульптуры прадстаўлялі вобраз нашага сучасніка — будаўніка новага грамадства, адлюстроўвалі радасць працоўных будняў, услаўлялі прыгажосць роднай прыроды.

Без перабольшання можна сказаць, што кожны паведвальнік падоўгу спыняўся ля скульптурнага партрэта «Старшыня» — увасабленне легендарнага К. Арлоўскага, які прадставіў І. Траян.

З шэрагам новых работ выступіла А. Лебядок-Ерамеева, вядомая сваімі партрэтамі перадавікоў сельскай гаспадаркі Магілёўшчыны. На гэты раз яе героі — кавалер ордэна Леніна трактарыст І. Кашынскі, загадчыца фермы, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, камсамолка А. Гарчакова, палявод А. Новікава.

«Мантажнікі», «Новы дом» — тэмы гравюр А. Ціткова.

Будні буйнейшых прадпрыемстваў Магілёва — камбінатаў шаўковых тканін і сінтэтычнага валакна адлюстраваны ў работах Н. Васіленкі.

Цікавыя палотны прадставілі таксама вядомыя мастакі Ю. Нікіфіраў, М. Федарэнка, У. Шпартаў і іншыя.

М. НОЖНІКАЎ.

ТВОРЧАЯ СУСТРЭЧА ЛІТАРАТАРАЎ

Гомельскае аддзяленне Саюза пісьменнікаў БССР наладзіла творчую сустрэчу літаратараў Бранскай, Чарнігаўскай і Гомельскай абласцей. Пісьменнікі выступілі па тэлебачанню. Празаік з Бранска А. Козін, паэты з Чарнігава С. Рэп'ях, Р. Ткачэнка, А. Алейнік, тамяльчане Л. Гаўрылкін, А. Капусцін і В. Ярац падзяліліся думкамі на тэму — пісьменнік і сучасны герой. Яны расказалі пра свае творы, прысвечаныя нашаму сучаснику — чалавеку працы.

Творчыя сувязі літаратараў суседніх абласцей, якія спаборнічаюць між сабой, сталі традыцыйнымі. Яны спрыяюць больш шырокаму асвятленню пісьменнікамі здабыткаў савецкіх людзей у вырашэнні задач па камуністычнаму будаўніцтву.

КОНКУРС ПРАЦЯГВАЕЦЦА

У чэрвені мінулага года ў нітотыднёвіку «Літаратура і мастацтва» былі надрукаваны ўмовы адкрытага конкурсу на эскізны праект помніка ў г. Магілёве ў гонар 50-годдзя Савецкай улады.

Міністэрства культуры БССР паведамляе, што тэрмін адкрытага рэспубліканскага конкурсу на эскізны праект указанага помніка прадоўжан да 15 красавіка 1976 года.

ПРЭМІЯ «ЛІТЕРАТУРНОГО ОБОЗРЕНИЯ»

Часопіс «Литературное обозрение» прысудзіў прэмію за лепшыя матэрыялы, якія былі змешчаны на яго старонках летась. Сярод адзначаных аўтараў — Алесь Адамовіч, якому прысуджана прэмія за артыкул «Двойчы народжаны» (№ 4).

АД КАМІТЭТА ПА ЛЕНІНСКІХ І ДЗЯРЖАЎНЫХ ПРЭМІЯХ СССР У ГАЛІНЕ ЛІТАРАТУРЫ, МАСТАЦТВА І АРХІТЭКТУРЫ ПРЫ САВЕЦЕ МІНІСТРАЎ СССР

Камітэт па Ленінскіх і Дзяржаўных прэміях СССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры пры Савеце Міністраў СССР, разгледзеўшы работы, прадстаўленыя на атрыманне Ленінскіх прэмій 1976 года рознымі дзяржаўнымі, грамадскімі і творчымі арганізацыямі, прыняў рашэнне дапусціць да ўдзелу ў конкурсе наступныя кандыдатуры:

1. **Авіжус І. К.** Раман «Страчаны прытулак».

Прадстаўлена рэдкалегіяй часопіса «Дружба народов», Саюзам пісьменнікаў Літвы.

2. **Андроннікаў І. Л.** Тэлевізійныя фільмы апошніх гадоў: «Успаміны аб вялікай зале», «Канцэрт у Ленінградскай філармоніі», «Слова Андроннікава».

Прадстаўлена Камітэтам па тэлебачанню і радыёвяшчанню Ленгаравыканкома, Дзяржаўным музеем А. С. Пушкіна.

3. **Ахмедаў А. Р.** — архітэктар, кіраўнік аўтарскага калектыву, **Сапараў С. Н.** — інжынер-будаўнік, **Данільянц М. І.** — брыгадзір цесляроў-бетоншчыкаў. Архітэктура будынка Туркменскай дзяржаўнай бібліятэкі імя Карла Маркса ў горадзе Ашхабадзе.

Прадстаўлена Дзяржбудам Туркменскай ССР, Саюзам архітэктараў Туркменіі.

4. **Зульфія (Ісраілава З.).** Цыкл вершаў «Вясёлка».

Прадстаўлена Саюзам пісьменнікаў Узбекістана.

5. **Максім Танк (Скурко Я. І.).** Кніга вершаў «Нарачанскія сосны».

Прадстаўлена Саюзам пісьменнікаў Беларусі, Дзяржкамвыдатам БССР, Дзяржаўнай бібліятэкай БССР імя У. І. Леніна.

6. **Маркаў Г. М.** Раман «Сібір».

Прадстаўлена ЦК ВЛКСМ, Саюзам пісьменнікаў РСФСР, рэдкалегіяй часопіса «Знамя», выдавецтвам «Молодая гвардия», ЦК прафсаюза работнікаў культуры.

7. **Абразцова А. В.** Канцэртныя праграмы 1973—1974 гадоў, і выкананне партый у операх «Сямён Катко», «Кармэн», «Трубадур» у Дзяржаўным акадэмічным Вялікім тэатры Саюза ССР.

Прадстаўлена Маскоўскай дзяржаўнай філармоніяй, Дзяржаўным цэнтральным музеем музычнай культуры імя М. І. Глінкі, Цэнтральным камітэтам прафсаюза работнікаў культуры.

8. **Пакроўскі Б. А.** Пастаноўка опер С. Пракоф'ева «Сямён Катко», «Ігрок» у Дзяржаўным акадэмічным Вялікім тэатры Саюза ССР і «Не толькі любоў» Р. Шчадрына ў Маскоўскім камерным музычным тэатры.

Прадстаўлена Дзяржаўным акадэмічным Вялікім тэатрам Саюза ССР, Усерасійскім тэатральным таварыствам.

9. **Цэрэтэлі З. К.** Комплекс манументальна - дэкаратыўных работ у горадзе Тбілісі, прасторава-дэкаратыўнае рашэнне курортнага гарадка Адлера і Паркавай зоны курорта Сайрме.

Прадстаўлена Саюзам мастакоў СССР, Саюзам мастакоў Грузіі.

10. **Шукшын В. М.** Мастацкія фільмы: «Печкі-лавачкі» вытворчасці кінастудыі імя Горкага, «Каліна чырвоная» вытворчасці кінастудыі «Масфільм» (сцэнарый, пастаноўка, выкананне роляў), кінасцэнарый «Я прыйшоў даць вам волю».

Прадстаўлена Саюзам кінематаграфістаў СССР, кінастудыяй «Масфільм».

* * *

Для шырокага азнаямлення з работамі, вылучанымі на атрыманне Ленінскіх прэмій, Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў СССР па тэлебачанню і радыёвяшчанню арганізуе цыкл перадач па радыё і па тэлевізійных цэнтрах, а Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў СССР па кінематаграфіі — дэманстрацыю фільмаў у гарадах краіны.

Вялікай дапамогай Камітэту па Ленінскіх і Дзяржаўных прэміях СССР з'явіцца актыўнае абмеркаванне прадстаўленых работ савецкай грамадскасцю і органамі друку. Камітэт звяртаецца да творчых і грамадскіх арганізацый, устаноў культуры, навукова-даследчых інстытутаў, а таксама да рэдакцый газет з просьбай арганізаваць абмеркаванне работ, пакінутых для ўдзелу ў конкурсе, да 15 сакавіка г. г.

Водгукі аб кандыдатурах, матэрыялы грамадскіх абмеркаванняў прысылаць у камітэт па адрасу: Масква, ГСП-4, Нягліная вул., дом 15.

ПЛЁН ПРАЦОЎНЫХ ЗДАБЫТКАЎ

Падведзены вынікі апошняга года дзевятай пяцігодкі. Савецкі народ зрабіў яшчэ адзін буйны крок наперад у сацыяльна-эканамічным развіцці сваёй краіны. Пра гэта сведчаць паведамленні Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення СССР і ЦСУ БССР, што днямі апублікаваны ў друку. У лічбах гэтых паведамленняў раскрываецца велічная панарама нашых здзяйсненняў. 1975 год пераможна зарярыў пяцігодку, якая не ведае сабе роўных і па прыросту вытворчасці, і па маштабах вырашэння сацыяльна-культурных задач, якія звязаны з паляпшэннем жыцця народа, задавальненнем яго культурных, матэрыяльных і духоўных запатрабаванняў.

Новымі здабыткамі сустракаюць працоўныя рэспублікі XXV з'езд КПСС і XXVIII з'езд Кампартыі Беларусі. Рабочы клас, калгаснае сялянства, інтэлігенцыя паспяхова выканалі, а па многіх паказчыках і перавыканалі ўстаноўленыя планавыя заданні.

Нацыянальны даход БССР за мінулае пяцігоддзе павялічыўся на 47 працэнтаў. Аб'ём вытворчасці прамысловай прадукцыі ўзрос на 61 працэнт. Павысілася эфектыўнасць вытворчасці. Прадукцыйнасць працы ў прамысловасці павялічылася на 43 працэнты.

Агульны аб'ём валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі склаў 5 мільярдаў рублёў або на 1,6 працэнта больш, чым у 1974 годзе, і на 18 працэнтаў — у параўнанні з сярэднягадавой вытворчасцю ў восьмай пяцігодцы.

Дасягнуты пэўныя вынікі ў капітальным будаўніцтве, іншых галінах народнай гаспадаркі рэспублікі.

Працаўнікі гарадоў і вёсак рэспублікі, аднадушна падтрымліваючы і горача адабраючы планы партыі, прымаюць павышаныя абавязацельствы, скіраваныя на паспяховае выкананне заданняў дзесятай пяцігодкі.

Сацыялістычныя абавязацельствы працоўных Беларускай ССР па павышэнню эфектыўнасці вытворчасці і якасці работы, датэрміноваму выкананню народнагаспадарчага плана днямі былі апублікаваны ў друку.

Вырашана за кошт рэзерваў павялічыць план сёлетняга года па выпуску прадукцыі на 215 мільёнаў рублёў і давесці тэмпы прыросту аб'ёму вытворчасці да 6,1 працэнта супраць 5,4 працэнта, якія намячаліся па праекту.

Намечана ў 1976 годзе павысіць аб'ём вытворчасці не менш чым на 7,5 працэнта замест 6,1 працэнта па плану, прадукцыйнасць працы адпаведна — на 5,7—6 працэнтаў супраць 4,5 па плану. Мяркуецца атрымаць сёлета дадаткова да плана прадукцыі на 280 мільёнаў рублёў, у тым ліку тавараў народнага спажывання на 130 мільёнаў рублёў.

Работнікі сельскай гаспадаркі бяруць абавязацельствы атрымаць у сярэднім па рэспубліцы з кожнага гектара пасеваў 27—28 цэнтнераў збожжавых і зернебабовых. Плануецца атрымаць сёлета ў калгасах і дзяржгасах 4 мільёны 200 тысяч тон малака, 960 тысяч тон мяса, 1 мільярд 250 мільёнаў штук яек.

Высокія абавязацельствы прынялі таксама будаўнікі, работнікі транспарту і сувязі, працаўнікі сферы гандлю і бытавога абслугоўвання.

У сацыялістычных абавязацельствах запісана: «Работнікі культуры, літаратуры і мастацтва:

— ажыццяўляць мерапрыемствы па далейшаму ўдасканаленню ідэйна-эстэтычнага і маральнага выхавання працоўных, расшырэнню працэсу ўсебаковага далучэння працаўнікоў гарадоў і вёсак да дасягненняў сацыялістычнай культуры;

узмоцняць творчы пошук па стварэнню яркіх, высокаідэйных мастацкіх твораў аб нашым гераічным часе, аб нашым сучаснику—будаўніку камунізму, твораў, у якіх будзе праслаўляцца натхнёная праца савецкіх людзей, дружба народаў нашай краіны, трыумф ленінскай нацыянальнай палітыкі КПСС;

паглыбяць інтэрнацыянальныя сувязі з культурамі брацкіх народаў Савецкай краіны, краін сацыялістычнай садружнасці, расшыраць абмен культурнымі каштоўнасцямі;

яшчэ больш умацоўваць сувязі ўстаноў культуры і мастацтва, творчых саюзаў з працоўнымі калектывамі, паглыбяць усебаковае вывучэнне жыцця рабочага класа, калгаснага сялянства, інтэлігенцыі рэспублікі, прапаганду і папулярызацыю дасягненняў перадавікоў і пачынанняў грамадскай вытворчасці».

Рабочыя і калгаснікі, інжынеры і тэхнікі, вучоныя і служачыя Беларусі поўны рашучасці сустрэць XXV з'езд выдатнымі справамі, упісаць яшчэ адну яркую старонку ў слаўны летапіс камуністычнага будаўніцтва.

У ВЯНОК ДРУЖБЫ

Яраслаў СМЕЛЯКОЎ

Расія

МАЦІ КАМУНІСТАЎ

Надпіс да фатаграфіі.

Час цябе не ссутуліў,
Погляд свеціцца зноў.
Прывітанне, матуля
Камуністаў-сыноў!

Дзеці ўсе падужэлі,
Што гушкала яна,
Апракалі шынелі,
Ваявалі спаўна.

Да канца ваявалі
І звінелі затым
Баявыя медалі
За сталом не пустым.

Галава пасівела.
Ты нялёгка жыла.
Стаць і бабкай паспела
І прабабкай была.

Большых сем'яў на свеце,
Чым яе, нестае.
І паўсюль твае дзеці
І ўнукі твае.

Не сядзелася ў хаце.
На здзіўленне ўсім
Мы з павагай на маці
Па-сыноўску глядзім.

І з любоўю нязменнай
Шлём табе наўздагон
Грамадзянскі, ваенны
Усеагульны паклон.

Пераклаў Ю. СВІРКА.

Аляксандр ПРАКОФ'ЕЎ

Расія

●

Калі мы ў агнямётнай лаве,
Бой ведучы, глыталі дым,
Мы мала думалі аб славе,
Аб лёсе і жыцці сваім.

Па-шчырасці—была ў нас думка
Інакшая — святлей, чым мёд:
Каб ад патронаў пухлі сумкі
І біў як трэба кулямёт!

Мы асядлалі гор дарогі
І ў скопішчы зямных падзей
Забыліся пра боль, трывогі,
Нястачы.
І пра плач дзяцей,

Пра хаты, за ракой даліны,
Палёў зялёны ўбогі клок,
Пяскі, разрэзы рыжай гліны —
Пра ўсё, што вабіла здалёк.

Але і ў гуле наступлення,
Які зямлю жалезам мёў,
Мы вымаўлялі горда: Ленін!
І як не вымавіць жа зноў!

У ім наш лёс:
І смех вясёлы,
І хлеб, і сонца, і дамы,—
Як дуб трымаецца за долы,
Так за яго заўсёды — мы!

Пераклаў М. КАЛАЧЫНСКІ.

Эдуардас СЕЛЯЛЁНІС

Літва

ЖЫЦЦЁ

Жыццё...
Яно ўжо, відаць, такое,
Пакуль ты з'яўляешся
Крупінкай яго жывой:
Сонца ўстае
Над зямлёй маладое —
То хмурыцца дзень,
А то зіхаціць сінявой.

Да яснасці крочыш ты
Праз імжу непагоды,
Шлях да яе
Ляжыць цераз кручы і гаць.
Які не заўсёды
Можна асэнсаваць.

Усё, што ствараеш ты
Для шчасця зямнога
На гэтым шляху цяжкім
Нават сябе самога
Без роздуму і развагі,
Як доўг,
Аддаеш другім.
Такое жыццё.

Шлях яго бесканечны.
Дык няхай жа
Даброе ўрачыстае над злом!
Шукаючы вечнае ў вечным,
І сам ты з'яўляешся
Для іншых цяплом
І святлом.

Пераклаў М. СМАГАРОВІЧ.

Віталій КАРОЦІЧ

Украіна

●

На подзвіг ідучы,
не прагнуць ордэнаў,
Не трызняць, не, удзячнасцю дзяржавы,
Не ўдакладняюць пры жыцці вагу сыноў,
Што варты стаць эквівалентам славы.

На подзвіг ідучы,
не ведаюць аб тым,
Якая ўсё-такі шчодрая Радзіма,
І называюць сціпла на шляху крутым
Усё, што стане подзвігам, магчыма.

Пераклаў М. МАЛЯЎКА.

СЯРОД КНІГ

ДУМАК ВЫСОКІ ЎЗЛЁТ

Паэзія напружанай думкі, палымянай грамадзянскасці, светлага пачуцця і імклівых парыванняў напоўніла старонкі гэтай кнігі. Кожны твор яе— своеасаблівы гімн тым, хто ідзе ў першых шарэнгах барацьбітоў за светлае заўтра.

Камуністы... Дэлегаты першых партыйных з'ездаў, чырвоныя камісары гадоў грамадзянскай вайны, героі пяцігодак і Вялікай Айчыннай, пакарыцелі цаліны і космасу. Ім прысвечаны куляшоўскія радкі, што даўно сталі хрэстаматыйнымі, а цяпер вынесены на першую старонку зборніка: «Камуністы — гэта слова, як са сталі; камуністы—гэта слова, як з агню».

Сярод іх быў, ёсць і заўсёды будзе наперадзе Уладзімір Ільіч Ленін. Хораша сказаў пра гэта Ул. Маякоўскі:

**Партыя і Ленін — двайня
братняя,—
аднолькава іх
маці-гісторыя ацэніць.
Мы гаворым—Ленін,
разумеем—
партыя,
Мы гаворым —
партыя,
разумеем—
Ленін.**

(Пер. П. Броўкі).

Леніну, камуністам партыі прысвячаюць свае творы 39 аўтараў: беларускія паэты і паэты сябры з іншых рэспублік. Для ўсіх іх«...да партыі нашай

любоў — назаўжды маладая!» (таджыкскі паэт А. Лахуці).

«Шляхі» Я. Купалы, «Свайму народу» Я. Коласа, «Думы аб партыі» Э. Агняцвет, «Старому камуністу» казахскага паэта М. Алімбаева, «Роднай партыі» А. Астрэйкі, «Домік І з'езда РСДРП»... Вершы, як быццам даўно знаёмыя, чытаныя неаднойчы, а вось звяртаешся да іх і хвалюешся зноў. Ты далучаешся да таго, што вечнае, як ПРАЎДА, ЖЫЦЦЁ, МУЖНАСЦЬ, ЧАЛАВЕЧНАСЦЬ, ты хочаш стаць лепшым, чысцейшым, ты бярэш для сябе ідэал: абагульнены вобраз Камуніста, для каго «Быць камуністам —быць змаганцам за светлы лёс людзей усіх!» (П. Броўка), «другам усіх народаў» (К. Кірэенка). І неяк па-свойму ўспрымаеш радкі Г. Бураўкіна, напісаныя ім яшчэ на пачатку творчай дарогі:

**Я з твайго неспакойнага
племені, Партыя,
Хоць ля сэрца білет твой яшчэ
не нашу,
Гэта ты разам з маці дала мне
упартую
І няўрымслівую душу.**

Сапраўды, найлепшыя думкі, помыслы кожнага з нас звязаны з партыяй, быць у яе радах—найвялікшая адказнасць і няменшае шчасце для чалавека: «...з-пад твайго бярэ крыла ўзлёт наш камсамольскі вырай» (Р. Барадулін). Цяплом гэтага крыла сагрэты штодзённыя справы савецкага народа.

Партыя... Гэта—«рука мільённапалая, сцятая ў адзін магутны кулак», сіла, здольная пераўтварыць жыццё планеты, зрабіць усіх людзей шчаслівымі. М. Танк у вершы «Партыя», як заўсёды, глядзіць на жыццёвыя з'явы ў дыялектычнай узаемасувязі:

**Партыя.
Я — адзін з яе радавых.
Я — адна толькі хваля таго
акіяна,
Што грудзямі прабіў
У ільдах векавых
Шлях Гальфстрыму,
Шлях сонцу нябачнага рання.**

Хвалюе верш «Калі падступаюць слёзы» П. Панчанкі. Ён шчыры, надзвычай чалавечны і зямны, бо паэт расказвае пра тое, што ў яго на сэрцы. А адкрытасць — таксама адна з асноўных якасцей камуністаў. І слёзы—своеасаблівае выражэнне радасці ад таго, што моцныя, знітаваныя рады ленінцаў: «Інтэрнацыянал» заспяваем—наследнікі Ільіча,—і слёзы тады падступаюць».

А колькі гордасці, упэўненасці і акрылёнасці ў творах А. Бачылы, В. Віткі, С. Дзяргая, П. Пестрака, паэтаў з братніх рэспублік: К. Куліева, А. Малышкі, Э. Межэлайціса, С. Стальскага, П. Тычыны!

Як тут не пагадзіцца з А. Куляшовым: «Хутка будуць называцца—знаю гэта—камуністамі ўсе людзі на зямлі!»

Алесь МАРЦІНОВІЧ.

Камуністы. Зборнік вершаў аб партыі. Укладальнік Я. Сіпакоў. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1975.

КРЫНІЦЫ

Камуністы Саюза пісьменнікаў Беларусі шырока абмяркоўваюць і горача адабраюць праект ЦК КПСС да XXV з'езда партыі «Асноўныя напрамкі развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1976—1980 гады».

ГОРАД высокапрадукцыйнай працы, высокай культуры і ўзорнага грамадскага парадку— так зараз называюць Наваполацк. Вялікія змены адбыліся тут за гады дзевятай пяцігодкі ў сацыяльна-культурным жыцці яго жыхароў.

Воля партыі, плённая праца савецкіх людзей, з'яднаныя ў адзіным парыве, твораць цуды. Здзейснены цуд на Заходняй Дзвіне. Адбыўся цуд у Магілёве, дзе нараджэнне гігантаў лаўсанавай вытворчасці перайначыла жыццё жыхароў гэтага старажытнага дняпроўскага горада. А хімічныя гіганты ў Гомелі і Гродна!

Вялікія змены адбыліся за гады дзевятай пяцігодкі паўсюль у нашай рэспубліцы. Гэта глыбока раскрыла ў сваім дакладзе аб праекце ЦК КПСС да XXV з'езда партыі па сходзе камуністаў Саюза пісьменнікаў рэспублікі намеснік старшыні Савета Міністраў БССР **Н. Л. Сняжкова.**

— Дзевятая пяцігодка, дзе ўпершыню за ўвесь папярэдні перыяд была сфармулявана задача максімальнага задавальнення матэрыяльных і культурных патрэб працоўных на аснове няспыннага росту эканомікі, паспяхова завершана, — сказала т. Сняжкова. Яна спынілася на поспехах эканомікі, прыводзіла лічбы росту асобных яе галін.

Лічбы яскравыя, унушальныя. Так, за гады пяцігодкі ў рэспубліцы агульны аб'ём прамысловай вытворчасці павялічыўся на 64 працэнты. Нацыянальны даход—на 47 працэнтаў.

Сямімільнымі крокамі развіваліся ў Беларусі машынабудаванне, прыборабудаванне і радыёэлектроніка, хімія і нафтахімія, вытворчасць мінеральных угнаенняў.

Зараз у Беларусі за месяц выпускаецца столькі прадукцыі, колькі выраблялася яе за ўвесь 1952 год. Працоўныя рэспублікі выпусцілі за гады пяцігодкі на 3 мільярды рублёў разнастайных тавараў дадаткова да плана і з іх на 1 мільярд рублёў тавараў народнага спажывання.

Мы ганарымся мінскімі электронна-вылічальнымі машынамі і трактарамі «Беларусь», аўтапаяздамі і магутнымі жодзінскімі самазваламі, баранавіцкімі станкамі з праграмным кіраваннем і мінскімі халадзільнікамі, віцебскімі дыванамі і гродзенскімі тканінамі...

Вялікая праграма за пяцігодку здзейснена ў капітальным будаўніцтве. Выраслі Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод і Магілёўскі камбінат сінтэтычнага валакна, Беларускі шынны камбінат і Баранавіцкі завод аўтаматычных ліній, Лукомльская ДРЭС і новыя вытворчасці Полацкага хімічнага камбіната...

Радуюць змены і ў сельскай гаспадарцы. Так, за чатыры гады валавая прадукцыя калгасаў і саўгасаў узрасла амаль на 20 працэнтаў, збор збожжа павялічыўся ў 1,6 раза.

На развіццё розных галін сельскай гаспадаркі зараз

Уладзімір КАРПАЎ:

«ЛІТАРАТУРА—ГЭТА НАРОДАЗНАЎСТВА»

Мінулы год, як, дарэчы, і папярэдні, прайшоў для мяне ў пошуках, роздуме і працы—пісаў кнігу ўспамінаў і апавяданняў «Прызнанне ў нянавісці і любві», карэктура якой цяпер ужо на маім рабочым стале.

Чаму я кажу—у пошуках?

Пра Вялікую Айчынную вайну я нямала пісаў. Значыць, трэба было знайсці невядомыя яшчэ табе подступы да знаёмай тэмы, новыя спосабы раскрыцця праўды аб людзях, аб тагачасных падзеях. Развагі прывялі да думкі—ці не ў самім выбары герояў, у якіх бы выразна адбіваўся час, і ўмацаванні самой жыццёвай пэўнасці тых сітуацый, у якіх яны дзейнічаюць, трэба шукаць выйсце? Не канструяваць сюжэты, не нагнятаць спецыяльна падабраныя перыпетыі, ведучы расказ да развязкі, а браць усё гэта з жыцця, абмяркоўваючы сваю задачу намаганнем як мага глыбей «извлечь» з жыццёвых фактаў сэнс.

Памагла мне ў гэтым мая папярэдняя работа над зборнікам успамінаў мінскіх падпольшчыкаў «Праз агонь і смерць», калі давялося сустракацца з дзесяткам жывых герояў і іх блізкімі.

Я па-ранейшаму перакананы: літаратура — гэта народазнаўства. І таму мяне цікавяць такія праблемы, як — чалавек і Радзіма, крыніцы і мяжа яго мужнасці, няўзброеныя людзі ў вайне, маці і вайна... Што з усяго гэтага атрымаецца — не ведаю, буду чакаць, якое слова скажа чытач.

Сёлета «Советский писатель» перавыдае на рускай мове мае раманы «Нямігі крывавыя берагі» і «За годам год». Кожнае новае з'яўленне твора ў свет патрабуе ад аўтара пэўнай работы. Я яшчэ раз перагледзеў раманы і мусіў сёе-тое палепшыць...

У гэтыя дні праходзіць XXVIII з'езд Кампартыі рэспублікі. Неўзабаве адбудзецца XXV з'езд КПСС. Таму ўжо сёння роцца новыя задумкі, звязаныя з дзейнасцю партыі, з рабочым класам, у чыім асяроддзі і нараджаюцца самыя светлыя пачынанні.

У 1975 годзе я пабываў у цэхах Мінскага радыёзавода, заводаў халадзільнікаў і электравылічальных машын, у канструктарскім бюро завода імя Кірава, у рабочых інтэрнатах мотавелазавода, спускаўся ў шахту Першага калійнага камбіната. Хочацца спадзявацца, што гэтая сувязь з рабочым класам рэспублікі прынясе свой плён.

Іса БАТАШАЎ

Кабардзіна-Балкарская АССР

АЙЧЫНЕ

Айчыне вялікай клянуся ў сваёй
любві непрытворнай.
З далёкіх вандровак вярнуся я к ёй—
рэспубліцы горнай.
Вярнуся, бо прагну, каб ветрам сваім
у твар мне дыхнула,
Каб у ветры салодкі пачуўся мне дым
майго дарагога аула.
Каб песня, з якою з дзяцінства знаём,
заўсёды гучала,
Нарэшце, пабачыць хачу родны дом —
Айчыны пачатак.

Пераклаў В. ЛУКША.

Гілемдар РАМАЗАНАЎ

Башкірыя

АБРЫСЫ БУДУЧАГА ВЕКУ

Уяўлялі, што ўсё яшчэ рана,
Што нядаўна ўзялі мы разбег.
Але ўжо праяснілся з туману
Дваццаць першы касмічны век.

Жыццё будзе ў ім светлым і веснім,
А Сусвет будзе домам адным.
Нашы дзеці
І лепшыя песні
Даляцяць і сустрэнуцца з ім.

Да яго паказальных вехаў
Скрозь паспешны «лірычны» каскад
Нашых дзён
Стагалосае рэха
Дакранецца, як гулкі набат.

Звонкім песням хапала ў нас месца,
Турбавала ўсё ж іншае нас —
З мужных твораў,
І шчырых сэрцаў
Век дваццаты глядзіць без прыкрас.

Мы салдаты яго, запявалы.
Са святлом век дваццаты ішоў:
Ён нас вывеў
З зямлянак, падвалаў
На арбіты касмічных гадоў.

Не чакаем пашаны і славы
Ды на ўзлёт
Ля цяперашніх вех,
Знаю, будзе раўняцца па праву
Дваццаць першы касмічны век.

Пераклаў Ю. СВІРКА.

Антанас ВЕНЦЛАВА

Літва

ШТОРМ

Па ранейшых ірвах не проста
Крочыць сцежкай сваёй стараны.
Парадзелі ля мора сосны —
Ветэраны апошняй вайны.

А над хвалямі — свецяцца зоры
І былое зачахла даўно.
Толькі памяці чуйнае мора
Развярэдзіць глыбокае дно.

Часта голас яно павышае,
Вые ветрам, і хваляй гудзе.
Толькі вочы зажмурыш — ўсплывае
Зноў вайна, ліхалецця дзень.

Прабягае вячэрняе сонца
Срэбнай стужкай па грэбені хваль.
І ты верыш, што ў роднай старонцы
Будзе ціхай, бязвоблачнай даль.

А навокал — ірвы ды наросты
Заімшэлыя ўсюды відны.
Парадзелі ля мора сосны —
Ветэраны апошняй вайны.

Пераклаў В. ШЫМУК.

Хуснітдзін ШАРЫПАЎ

Узбекістан

ПУНКТ АПОРЫ

Ты здавалася чэзлай,
бясследнай,
Толькі ж вабіла повідні мас,
Мара ўзнёслая Архімеда,
Скалануўшы грымотна
свой час!
Шмат было іх,
упартых да змору,
Хто ў мальбе,
сіле духу
й мяча
Бачыў пункт запаветны апоры,
Каб зрабіць усясветны рычаг.
Яны лезлі на трон і ў падвалах
Хіжасць іх атуляла імгла.
Хоць гісторыя стала сівая,
Ды адказ ім знайсці не магла.
Але,
узняўшыся неяк
адразу
Над усім,
чый пагас ужо кліч,
Той адказ даў
і мудрым адказам
Абяссмерціў эпоху
Ільіч!..
Не яздок, што гарцуе па стэпе,
На якім балявала камча,
Ён убачыў апору
не ў небе,
Не на кончыку вострым мяча.
Ён адчуў — гэта рукі рабочыя,
І зямлю імі з месца скрануў
І, скарыўшы
ўсе сілы пабочныя,
Тварам к сонцу
яе павярнуў.

Пераклаў М. КАЛАЧЫНСКІ.

ТВОРЧАСЦІ

выдаткоўваецца штогод 1 мільярд рублёў капітальных укладанняў. І, безумоўна, гэта прыносіць значную аддачу. Нягледзячы на неспрыяльны для хлебаробаў мінулы год, у рэспубліцы прададзена звыш плана 2 мільёны тон зерня і мільён 700 тысяч тон бульбы.

Ажыццёўлена шырокая праграма сацыяльна-культурных змен. Па размеру выдзеленых для гэтай мэты сродкаў і па шырыні іх выкарыстання дзевятая пяцігодка не ведае сабе роўных. Толькі на ахову здароўя, адукацыю і культуру было выдаткавана 719 мільярдаў рублёў — на 55 працэнтаў больш, чым у папярэдняй пяцігодцы. Каля 22 мільёнаў квадратных метраў жылля атрымалі навасёлы рэспублікі. У 2 мільёнаў 300 тысяч чалавек павышана заработная плата. Гэтая лічба ўзрасце на 1 мільён 300 тысяч чалавек, калі прыняць пад увагу павышэнне стыпендый, пенсій, стварэнне лепшых умоў для інвалідаў вайны і працы.

Велічныя гарызонты для працы і вытворчасці адкрывае новая пяцігодка перад кожным савецкім чалавекам. Агульны аб'ём вытворчасці павінен узрасці да 43 працэнтаў. Першаступеннае значэнне набудзе развіццё такіх галін прамысловасці, як машына- і станкабудаванне, радыёэлектроніка і вытворчасць электронна-вылічальных машын, хімія і нафтахімія. У 1,3 разы павялічыцца выпуск тавараў лёгкай прамысловасці. Галоўная стаўка робіцца на павышэнне эфектыўнасці працы і паляпшэнне якасці прадукцыі.

Як і раней, намечана шырока весці будаўніцтва новых прадпрыемстваў, рэканструкцыю і мадэрнізацыю дзеючых. На гэтыя мэты выдаткоўваецца больш чым 700 мільярдаў рублёў. Завершыцца будаўніцтва Чацвёртага Салігорскага калійнага камбіната, трэцяй чаргі Магілёўскага камбіната сінтэтычнага валакна, Жлобінскай фабрыкі штучнага футра і Слонімскай прадзільна-ніткавай фабрык, Кобрынскага камбіната плашчовых тканін і Добрушскага завода фарфоравага посуду... Сотні іншых вялікіх і малых прадпрыемстваў вырастуць на беларускай зямлі.

Значныя задачы пастаўлены і перад сельскімі працаўнікамі ў павышэнні ўрадлівасці зямель, вытворчасці кармоў, атрыманні высокіх надояў малака і важкіх прываг жывёлы.

Дзесятая пяцігодка азнаменуецца далейшым павышэннем дабрабыту працоўных, значным сацыяльна-культурным будаўніцтвам.

Дакладчык падрабязна расказала пра планы нашай партыі па далейшаму развіццю навукі, культуры, адукацыі, аховы здароўя, пракаменціравала лічбы, прааналізавала сённяшняе становішча розных галін гаспадаркі.

— У праекце ЦК КПСС да XXV з'езда партыі перад кожным працаўніком пастаўлены велічныя планы, — сказала далей Н. Л. Сняжкова. —Кожны павінен вызначыць зараз сваё месца ў агульным страі, у выкананні гэтых планаў.

Пра задачы, што паўстаюць у дзесятай пяцігодцы перад пісьменнікамі, дзеячамі культуры і літаратуры, у праекце ЦК КПСС да XXV з'езда партыі запісана: «Забяспечыць далейшае павышэнне ролі сацыялістычнай культуры і мастацтва ў ідэйна-палітычным, маральным і эстэтычным выхаванні савецкіх людзей, фарміраванні іх духоўных запатрабаванняў». Пра тое, што зроблена супрацоўнікамі Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы ў гэтым напрамку, што мяркуецца яшчэ здзейсніць, гаварыў на сходзе яго дырэктар, пісьменнік **Іван Навумєнка.**

— Якасць нашых твораў, іх уздзеяння на чытача павінны быць лепшымі і большымі,—сказаў у сваім выступленні **Алесь Асіпенка.** У прыватнасці, ён гаварыў пра тое, што за апошні час з'явілася мала твораў, якія б прыцягвулі ўвагу грамадскасці рэспублікі. У той жа час значна павысіўся кругагляд людзей, іх інтэлект і культура. Менавіта таму трэба глыбей вывучаць жыццё і глыбока адлюстроўваць яго ў сваіх творах.

Мікола Ткачоў спыніўся на поспехах выдавецтва «Мастацкая літаратура», што дасягнуты за апошні час. З году ў год растуць колькасць і тыражы кніг, паляпшаецца іх мастацкае афармленне.

Пра выпуск даведачнай і энцыклапедычнай літаратуры, пра пашырэнне сувязей рэдактараў БелСЭ з Саюзам пісьменнікаў, пра праблемы, якія стаяць перад літаратарамі, гаварыў у сваім выступленні **Янка Казека.**

— Усе мы кроўна звязаны з дзейнасцю партыі і народа,—сказаў **Міхась Калачынскі.** — Сёння на сходзе мы абмяркоўваем пытанні, што тычацца народнай гаспадаркі, сацыяльна-культурных змен. Зараз у агульнанароднае рэчышча абмеркавання праекта ЦК КПСС да XXV з'езда КПСС уліваюцца прапановы і нашага пісьменніцкага сходу.

Сваё выступленне ён прысвяціў пытанням выхавання чалавека, праблемам эстэтычнай і антырэлігійнай прапаганды.

Аляксандр Міронаў гаварыў пра герояў дзевятай пяцігодкі, пра тое, што мала з'явілася пра іх цікавых нарысаў, мастацкіх твораў, што пісьменнікі перад імі ў вялікім даўгу. Такія ж думкі выказваў і **Вячаслаў Адамчык,** аналізуючы літаратуру пра маладога сучасніка.

Клопатам пра паляпшэнне якасці мастацкай прозы, пра ідэйны змест кінафільмаў, тэле- і радыёперадач было прасякнута выступленне **Івана Мележа.**

— Мы павінны лепш і больш поўна раскрываць у сваіх творах сацыялістычны лад жыцця, — сказаў **Іван Шамякін.**—Гэта — асноўная наша задача.

У сваім выступленні ён спыніўся на тэмах, якія, на яго думку, яшчэ дрэнна асветлены ў творах, аб праблемах, што неабходна вырашаць, каб дапамагаць выхоўваць высокаідэйнага, высокасвядомага, культурнага і адукаванага чалавека.

Тры крыніцы пастаянна даюць сілу нашай літаратуры і мастацтву: культурныя традыцыі народа, уздзеянне братніх культур і літаратур, дыханне сучаснасці. Зараз перад намі ўзнікаюць новыя задачы, якія вызначаны ў праекце ЦК КПСС да XXV з'езда партыі. У агульнанароднае рэчышча іх плённага вырашэння ўвальецца і праца беларускіх пісьменнікаў і дзеячаў культуры.

Партыйны сход Саюза пісьменнікаў рэспублікі горача адобрыў праект ЦК КПСС да XXV з'езда КПСС «Асноўныя напрамкі развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1976—1980 гады». Камуністы заклікалі ўсіх пісьменнікаў і літаратараў паспяхова выконваць задачы, якія ставіць партыя.

А. АСТРЭЙКА.

Задумы, планы, здзяйсненні

Валянцін МЫСЛІВЕЦ:

«КЛІЧА РАБОЧАЯ ТЭМА»

Задум шмат. Есць і жыццёвыя назіранні. Напісана ж, на жаль, не так і многа.

Летась убачыла свет кніга «Крылаты канвеер» — пра пчол, пра вострыя і надзённыя пчалярскія праблемы, пра саміх пчаляроў.

Здадзена ў друк кніга нарысаў «Партрэты знаёмых». У ёй расказваецца пра земляноў А. Р. Чарвянова, пра герояў дзевятай пяцігодкі, з якімі даводзілася сустракацца на Беларускім аўтазаводзе, на гомельскім заводзе «Цэнтраліт», у іншых гарадах рэспублікі.

Закончыў шматгадовую працу над раманам «Мужанцы» — пра сорак пяты, гераічны і цяжкі, багаты на эпахальныя падзеі год.

Прапанавана ў часопіс «Маладосць» аповесць «Расставанне» з кнігі пра марскіх пагранічнікаў.

Настойліва кліча незабыўная рабочая тэма. І калі да твораў на гэтую тэму з'явіцца сапраўдная цікавасць, а, значыць, і спрыяльныя ўмовы для творчасці гэтага напрамку — спадзяюся напісаць нешта патрэбнае людзям.

Мікола ГРОДНЕЎ:

«ТРАКТАРАЗАВОДЦЫ— ПРАТАТЫПЫ ГЕРОЯЎ»

Некалькі гадоў назад выйшла мая дакументальная аповесць «Высокі поўдзень» пра Героя Сацыялістычнай Працы, слесара-лякальшчыка Мінскага трактарнага завода Яўгена Іванавіча Клімчанку. Але і пасля гэтага бываў шмат на прадпрыемстве, сустракаўся з рабочымі і яго кіраўнікамі. Сабралася нямала фактычнага матэрыялу. У блакнотах занатаваны цікавыя назіранні над жыццём аднаго з буйнейшых прадпрыемстваў рэспублікі. Тады і ўзнікла ў мяне задума—напісаць новы твор пра людзей трактарнага завода.

Праца над ім — а ён будзе называцца «Салодкі боль» — заняла шмат часу і клопатаў. Цяпер яна закончана і ў некалькіх словах магу сказаць пра гэты раман. Прататыпы ўсіх маіх герояў—людзі трактарнага: рабочыя, кіраўнікі прадпрыемства, інжынеры, служачыя.

У галоўным герое Лінькове ўгадваецца былы дырэктар завода, Герой Сацыялістычнай Працы Мікалай Нікіціч Слюнькоў, прататып слесара-лякальшчыка Сцяпана Кірэйчыка — ужо знаёмы чытачу Яўген Клімчанка.

НА ПАСЯДЖЭННІ ПРЭЗІДЫУМА ПРАЎЛЕННЯ СП БССР

28 студзеня адбылося чарговае пасяджэнне прэзідыума праўлення Саюза пісьменнікаў БССР. Першы намеснік старшыні праўлення І. Шамякін азнаёміў прысутных з пастановай сакратарыята СП СССР аб падрыхтоўцы да VI з'езда пісьменнікаў СССР.

Прэзідыум заслухаў інфармацыю галоўнага рэдактара газеты «Літаратура і мастацтва» Хв. Жычкі аб асвятленні літаратурнага працэсу на старонках газеты напярэдадні XXV з'езда КПСС і пісьменніцкіх з'ездаў — VII рэспубліканскага і VI Усесаюзнага.

Выступілі пісьменнікі А. Асіпенка, А. Адамовіч, Ул. Карпаў, І. Шамякін, І. Пташнікаў, А. Гардзіцкі, М. Танк, намеснік міністра культуры БССР С. Пятровіч.

Прэзідыум разгледзеў пытанне адносна правядзення справаздачных сходаў у абласных аддзяленнях — Гродзенскім, Гомельскім і Магілёўскім. Гэтыя сходы вырашана правесці ў лютым — сакавіку.

Аб падрыхтоўцы да дзён літаратуры на Гродзеншчыне, якія будуць праходзіць пад дэвізам «Натхнёнае слова пісьменнікаў — XXV з'езду КПСС» паведаміў дырэктар бюро прапаганды мастацкай літаратуры Саюза пісьменнікаў БССР М. Татур.

М. КАНДРАЦЬЕЎ. Партрэт сталявара МТЗ Н. І. Арцюша.

ШЫРЫНЯ ШУКАННЯЎ, БАГАЦЦЕ ПОЧЫРКАЎ

ШМАТГРАННАЕ жыццё нашага сучасніка, праца і творчасць савецкіх людзей — вось галоўныя тэмы рэспубліканскай мастацкай выстаўкі, якая адкрылася 2 лютага ў Мінскім Палацы мастацтваў. У экспазіцыі, дэвіз якой «Слава працы», больш чым 700 твораў жывапісу, скульптуры, графікі, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, створаных у апошнім годзе пяцігодкі.

— Своеасаблівасць, непаўторнасць гэтай выстаўкі ў тым, што яна па сутнасці ўпершыню поўнасцю прысвечана сучаснай тэматыцы, — сказаў на яе адкрыцці старшыня праўлення Саюза мастакоў БССР В. С. Пратасеня. — Яна красамоўна паказвае, што сучасная тэма, тэма чалавека працы стала адной з галоўных у творчасці беларускіх майстроў пэндзля і разца.

Паказ адкрывае манументальная скульптура У. І. Леніна работы лаўрэата Ленінскай прэміі С. Селіханава. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, народны мастак БССР М. Савіцкі паказвае карціну «У полі» — паэтычны сказ аб нялёгкай жніўнай пары хлебароба. Народны мастак СССР З. Азгур знаёміць са скульптурнымі партрэтамі вядомых дзеячаў беларускай навукі і культуры. Лаўрэат прэміі імя Дж. Нэру Г. Паплаўскі прадставіў на суд гледачоў новую серыю графічных работ «Браслаўшчына — край азёрны» — лірычныя роздумы аб прыгажосці роднай зямлі, аб чалавеку — творцы гэтай прыгажосці.

Шырыня шуканняў, багацце творчых почыркаў вызначае сёння беларускі жывапіс. Высокім майстэрствам, актыўнасцю аўтарскай пазіцыі прыцягваюць сакавітыя, насычаныя колерам палотны Л. Шчамялёва, А. Малішэўскага, паэтычныя карціны Р. Кудрэвіч, эмацыянальныя пейзажы народнага мастака БССР В. Цвіркі, напісаныя ў шырокай жывапіснай манеры тэматычныя карціны А. Шыбнёва, Н. Воранава, М. Данцыга, В. Грамыкі, В. Сумарава і многіх іншых аўтараў.

Значнае месца ў экспазіцыі займае графіка. Прыкметная цяга мастакоў да серый работ, якія даюць магчымасць глыбей раскрыць разнастайнасць жыцця нашага сучасніка. Творчую, дынамічную атмасферу часу добра перадаюць графікі П. Дурчын у серыі «Нафтавікі Палесся», В. Пашчасцьеў у цыкле афортаў «Беларускі граніт», І. Капялян — «Працаўніцы Новалукомля», У. Басалыга ў «Песнях працавітасці» і іншыя мастакі.

Добра прадстаўлена на выстаўцы скульптура. Работы Л. Гумілеўскага, Дз. Папова, Л. Давідзенкі, А. Курачкіна сведчаць аб плённасці пошукаў іх аўтарамі выразнасці і гібкасці мовы скульптуры, сугучнасці яе высокім патрабаванням часу.

Разнастайнасцю жанраў радуе раздзел дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, эмацыянальным напалам вызначаюцца экспануемыя плакаты.

Выстаўка прысвячаецца XXV з'езду КПСС.

На адкрыцці выстаўкі прысутнічала намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Н. Л. Сняжкова.

БЕЛТА.



Ю. БІРЫН. Партрэт Янкі Купалы.

Р. КУДРЭВІЧ. Пара сенакосная.

У. МІХАЙЛОЎСКІ. На БелАЗе.

БАЯВЫ ЖАНР

У Магілёве прайшоў заключны гарадскі агляд-конкурс аматараў мастацкага чытання. У ім прынялі ўдзел 75 пераможцаў папярэдніх мясцовых конкурсаў — рабочыя, служачыя, студэнты.

Немагчыма падрабязна расказаць пра кожнага з чытальнікаў, якія на працягу пяці гадзін спрачаліся за права ўдзельнічаць у наступным — абласным конкурсе. Гэта было сапраўднае свята мастацкага слова! Але, на жаль, слухачамі цікавага спаборніцтва былі толькі самі ўдзельнікі конкурсу ды члены журы. Між тым, кантакт з гледачамі, несумненна, дапамог бы самадзейным артыстам паказаць больш высокае майстэрства, ды і аўдыторыя атрымала б ад многіх нумароў самае сапраўднае задавальненне.

З цікавай праграмай выступіла група чытальнікаў камбіната сінтэтычнага валакна імя У. І. Леніна. Асабліва паспяхова самадзейныя артысты выканалі літаратурна - музычную кампазіцыю з твораў савецкіх аўтараў «Адваяваная вясна». Уражліва, з вялікім пачуццём і з не меншым густам прачытаў рабочы гэтага ж камбіната Л. Шульц урывак з рамана М. Шолахава «Яны змагаліся за Радзіму». Добра выканала кампазіцыю «Маё «адкрыццё» Амерыкі», складзеную з твораў У. Маякоўскага, неаднаразовы дыпламант абласных і рэспубліканскіх конкурсаў чытальнікаў архітэктар І. Голубева. Яна свабодна трымалася на сцэне, голас яе гучаў выразна і праўдзіва. Было шмат і іншых цікавых выступленняў.

Пяты год пры машынабудаўнічым інстытуце працуе студыя мастацкага слова. Кіруе ёю заслужаная артыстка БССР Зоя Малчанава. Удзельнікі студыі — Вольга Краўчук, Тамара Аўсяніка-ва, Генадзь Брайман, Віталь Пазняковуў, Хрысціна Налетава паказалі на конкурсе разнастайную, цікавую праграму і досыць высокае выканаўчае майстэрства.

На вопыту будучых машынабудаўнікоў падобныя студыі створаны пры бібліятэчным тэхнікуме, педагагічным інстытуце, будаўнічым тэхнікуме, медыцынскім, педагагічным, культурна - асветным вучылішчах, клубах заводаў «Электрарухавік», аўтамабільнага імя С. М. Кірава, пры Доме культуры чыгуначнікаў. Зразумела, што маладым калектывам давядзецца яшчэ шмат папрацаваць.

У адрозненне ад ранейшых, гэты конкурс паказаў колькасны і якасны рост аматараў мастацкага чытання. Разам з тым ён выявіў і недахопы. У конкурсе ўдзельнічалі і такія аматары мастацкага чытання, якія слаба валодалі голасам, фарсіравалі гук, злоўжывалі жэстамі. Яны не разумеюць, што ў мастацкім чытанні, як і ў вакальным мастацтве, існуюць і фортэ, і фартысіма, і сярэднія ноты. І ўсімі гэтымі прыёмамі неабходна карыстацца ўмела.

Асобныя чытальнікі ставяць перад сабой абмежаваную задачу — добра вывучыць тэкст, каб не збіцца. Дасягнуўшы гэтага, яны заспакойваюцца. Чытальнік болей чым акцёр любога іншага жанру павінен працаваць дома, крытычна правяраць усё, што на першы погляд здаецца добрым, завершаным. Патрабавальнасць да сябе прымушае лепшых чытальнікаў нястомна шукаць дасканалую форму выканання, глыбей уникаць у змест твора, акцэнтаваць тое, што можа сёння прагучаць найбольш сучасна.

Многія з самадзейных чытальнікаў браліся адразу за вельмі складаныя творы, якія аказаліся ім не пад сілу.

Добры чытальнік у нейкай меры — саўтар твора, ён можа яго па-рознаму трактаваць, уклаўці ў яго часцінку свайго я.

Ясна і другое — аматары маюць вялікую патрэбу ў дапамозе майстроў. Я шмат думаў над тым, як не арганізаваць. На перыферыі мала чытальнікаў-прафесіяналаў, таму іх трэба выкарыстоўваць як мага лепш і эфектыўней. У гарадах, дзе ёсць прафесіянальныя і народныя тэатры, неабходна ствараць гурткі мастацкага слова, там, дзе іх няма, замацаваць усіх, хто захапляецца мастацкім словам, за асобнымі майстрамі. Няхай аматары самастойна рыхтуюць нумар і раз ў 2—3 месяцы прыязджаюць на кансультацыю да майстра. Такая практыка зрабіла б сваю справу — праз два-тры гады культасветустановы атрымалі б кваліфікаваных чытальнікаў, а магчыма, і кіраўнікоў гурткоў.

Мастацкае чытанне не толькі далучае слухачоў да скарбніцы савецкай і сусветнай літаратуры, яно выступае як прапагандыст і агітатар. Вось чаму так важна дабіцца, каб у кожным клубе, Доме і Палацы культуры, навучальнай установе гэты баявы жанр заняў дастойнае месца.

Хочацца пажадаць шчаслівай дарогі ў вялікае мастацтва самадзейным артыстам. І няхай ім заўсёды будзе надзейным спадарожнікам і сябрам таварыш слова.

А. ГОЛЫШ,

старшы метадыст па тэатральнай самадзейнасці Магілёўскага абласнога Дома народнай творчасці, член журы.

Гэтыя маладыя работніцы Крычаўскага цэментна-шыфернага камбіната ўмеюць не толькі добра працаваць,— яны і выдатныя самадзейныя артысты.

Здымак быў зроблены ў той момант, калі Зінаіда Каліноўская, Тамара Сідарэнка і Людміла Казлова прыйшлі на рэпетыцыю.

Фота В. БЫСАВА.

НАТХНЕННЕ

НАРОДНАМУ тэатру Упраўлення бытавога абслугоўвання горада Гомеля споўнілася дваццаць гадоў. Прыблізна такі ж узрост большасці яго артыстаў. Нягледзячы на маладосць удзельнікаў, калектыў гэты даволі сталы. І доказ таму — званне народнага, прысвоенае яму пяць гадоў назад.

Людзі розных узростаў, інтарэсаў, прафесій (Ніна Авакумава — інжынер-будаўнік, Яфім Гіршман — майстар на фабрыцы «8-та Сакавіка», Надзея Канавалава — загадчыца канцылярыі, Валянціна Лук'янава — чарцёжніца, Іна Брусіла — цырульнік) — яны аб'яднаны агульнай любоўю да мастацтва.

Любоў да тэатра — гэта тое, што змацоўвае калектыў, робіць яго адным цэлым.

Асноўны напрамак тэатра — п'есы сучаснікаў і пра сучаснікаў. Якраз у гэтым плане тэатрам створаны найбольш сур'ёзныя, цікавыя работы.

Характэрна ў гэтым сэнсе п'еса М. Анкілава «Салдацкая ўдава». Пастаўлены да 30-годдзя Вялікай Перамогі над фашысцкай Германіяй, спектакль гэты быў не толькі актуальны і своечасовы, але, што не менш важна, патрэбны маладым самадзейным акцёрам. У спектаклі няма ні аднаго выбуху, дзеянне адбываецца далёка ад фронту, у Сібіры, але п'еса гэтая пра вайну. Тэма вайны раскрываецца праз чалавечыя лёсы, галоўным чынам праз жаночыя. Вайна адгрымела задоўга да таго, як нарадзіліся большасць выканаўцаў, ніхто з тых, хто іграе спектакль, не адчуў на сабе яе жахаў, яны дзеці тых, хто заваёўваў перамогу. Але спектакль любімы артыстамі, блізкі ім, як можа быць любімым і блізкім усё тое, што перажыў наш народ, чым на праву ганарыцца наша краіна.

Часта звяртаецца калектыў і да класічнай спадчыны, канкрэтна, да творчасці А. М. Астроўскага. Як расказвае рэжысёр тэатра І. П. Матросава, рашэнне іграць «Снягурку» не было ні для каго неспадзеўкай. Больш таго, Астроўскага ставілі і раней, а за спектакль «Не ўсё кату масленіца» былі нават адзначаны дыпломам першай ступені на рэспубліканскім конкурсе. Аднак калектыву быў патрэбен спектакль, у якім маладыя акцёры змаглі б выявіць саміх сябе, свае пачуцці, свае перажыванні. Менавіта такім блізкім і патрэбным моладзі з'явілася «Снягурка» — рамантычная казка, поўная святла і шчырай любві.

Народны тэатр Упраўлення бытавога абслугоўвання вядомы не толькі гамяльчанам, але і жыхарам вобласці. Гэты калектыў часты госць на прадпрыемствах, у калгасах, у вёсках і пасёлках Гомельшчыны. І не было выпадку, каб артысты прыязджалі куды-небудзь двойчы з адным і тым жа спектаклем. Пошук свайго аблічча, пошук свайго рэпертуару — вось тое асноўнае, што прымушае быць увесь час у творчай напружанасці, у рабоце. Тэматычныя спектаклі, творчыя вечары, размовы аб тэатры — усё гэта не фармальныя мерапрыемствы, а якраз тое, без чаго не могуць жыць ні маладыя, поўныя энергіі артысты, ні іх рэжысёр, чалавек удумлівы, дапытлівы, неспакойны. Усё тое, чым жыве свет сёння, не можа не хваляваць нашага сучасніка. І артысты народнага тэатра імкнуцца сваёй працай, сваімі спектаклямі паказаць грамадзянскія адносіны да тых, ці іншых бакоў жыцця. Сцэна для акцёраў — трыбуна, з якой можна сказаць многа добрага і паказаць дрэннае.

Спектаклем, які шмат у чым стаў паваротным для тэатра, з'явіўся «Зацюканы апостал» па аднайменнай п'есе А. Макаёнка. Барацьба з мяшчанствам, застоем, пошукі праўды, адчуванне прыналежнасці да ўсяго свету, пачуццё агульнасці з чалавецтвам — вось што хвалюе герояў п'есы. І тое, што героі п'есы і артысты, якія іграюць іх — равеснікі, асабліва важна для таго, каб зразумець, з якім энтузіязмам, з якой любоўю рыхтавалі, а цяпер іграюць гэты спектакль самадзейныя артысты.

Ноччу, калі горад заціхае, яны выходзяць з будынка Дома культуры. Смяюцца, спрачаюцца, абмяркоўваюць мінулую рэпетыцыю, гавораць аб будучых спектаклях.

Наперадзе новыя пошукі, новыя ўдачы і знаходкі.

А. РОСІН.

ЧАСОПІСЫ Ў ЛЮТЫМ

«МАЛАДОСЦЬ»

XXV з'езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза прысвечаны вершы «Партыі» Л. Дайнекі і «Інтэрнацыянал» Р. Барадуліна. Паэзія прадстаўлена таксама падборкамі Ул. Скарынкіна і А. Касценя, «Трынціхам» Л. Забалоцкай, новымі творамі В. Макарэвіча. Да 70-годдзя з дня нараджэння вядомага савецкага паэта, Героя Савецкага Саюза М. Джаліля змешчаны яго вершы.

Друкуецца новая аповесць А. Жука «Зоркі над палігонам», апавяданне Ул. Карпава «Прызнанне ў любві».

«Прашу прыняць ў рады КПСС»—фотарэпартаж В. Ждановіча. З матэрыяламі «Радок у рапарт», «Высокія імкненні» выступаюць К. Платонаў і С. Кухараў.

«Покліч сэрца, абавязак грамадзяніна»—анкета часопіса.

С. Андраюк у рэцэнзіі «Пашыраюцца далягляды» піша пра першы выпуск зборніка «Далягляды». Артыкул Ул. Халіпа «Галоўная тэма—подзвіг» пра Брэсцкі абласны тэатр імя Ленінскага камсамола Беларусі.

З артыкулам «Дыялогі з палымянай памяццю» выступае В. Рагойша.

«НЕМАН»

«Час гаворыць...» — інтэрв'ю са старшынёй Савета Міністраў БССР Ц. Я. Кісялёвым.

«Ад усяго сэрца»—падборка вершаў М. Танка, М. Смагаровіча, П. Макаля, А. Русецкага, Г. Бураўкіна, П. Панчанкі, В. Віткі, П. Пранузы. На рускую мову іх пераклалі Б. Спрынчан, Б. Кежун, І. Васілеўскі.

Друкуецца ў аўтарызаваным перакладзе В. Шчадрыной раман Л. Гаўрылкіна «Не магу без цябе». З новай аповесцю выступае Ул. Савіцкі—«Улька».

У раздзеле «Публіцыстыка»—выступленні А. Бялевіча «Камуністы» і Э. Ялугіна «Як хлеб, як руда». «Рэзервы працоўныя» прадстаўлены артыкулам Ф. Зайца «Тысяча сто шляхоў».

З успамінамі выступаюць Ф. Герашчанка і С. Куцанаў—«Тата, забі фашыста!».

М. Канеў рэцэнзуе «Маабіцкі сшытак» М. Джаліля, М. Кенько піша пра кнігу «Слухайце, Хатынь!», А. Аўруцін разглядае другія кнігі паэтаў М. Копанева, Г. Казака, Б. Ганкіна. Аб успамінах пра Янку Купалу «Такі ён быў» дзеліцца ўражаннямі Г. Шыдлоўская.

АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ МАРЫ

РЭПАРТАЖ З МІНСКАГА ІНСТЫТУТА КУЛЬТУРЫ

У ПАКОЙ заходзіць дзяўчына з бледным усхваляваным тварам. На дыбачках падыходзіць да акна, спыняецца ля яго, і некалькі імгненняў пільна назірае за вуліцай. Потым ідзе ў процілеглы куток пакоя, з-пад палавіц дастае радыёперадатчык, ставіць на стол, цягне да сцяны антэну. Здымае чаравік, дастае адтуль паперку з шыфрам, садзіцца ля перадатчыка, пачынае выстукваць марзянку...

Так пачынаецца эцюд «Радыстка», які выконвае студэнтка першага курса факультэта культасветработы Мінскага інстытута культуры Галіна Мацвіенка.

Хваляванне на твары дзяўчыны непадробнае, ці то ўвайшла ў ролю падпольшчыцы-радысткі, ці то ад першага ў яе жыцці заліку, ды яшчэ якога — па рэжысуры і майстэрству акцёра. А прымаюць залік загадчык кафедры рэжысуры і акцёрскага майстэрства народны артыст рэспублікі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Іосіф Сцяпанавіч Папоў ды іншыя выкладчыкі кафедры, у асноўным, вядомыя беларускія артысты.

Зразумела, ніякага, так сказаць, антуражу пад рукой у студэнткі няма, але трэба паказаць, ды так, каб табе паверылі, што маеш справу з рэальнымі рэчамі — перадатчыкам, антэнай, шыфрам, што кожную мінуту цябе можа высачыць вораг... Ці ўдаецца гэта Галі? У нейкія моманты на тварах членаў камісіі паяўляюцца ўсмешкі. Заўважым — спачувальныя, спагадлівыя. Ну, што ж. Шлях да майстэрства доўгі і цяжкі. Пройдзе некалькі гадоў і будучы кіраўнік самадзейнага тэатральнага калектыву Галіна Мацвіенка сама будзе вось так ацэньваць, вучыць людзей, што вырашылі прысвяціць сябе служэнню Мельпамене.

Адна адну змяняюць сцэнкі, што разыгрываюць студэнты. «Модніца», «Знаёмства», «Спатканне», «Неспакойнае дзіцё», «Дождж»...

— Усе гэтыя эцюды, — расказвае Іосіф Сцяпанавіч, — не толькі сыграны, але і зрэжысіраваны студэнтамі. Ёсць удалыя работы, над іншымі яшчэ трэба працаваць. Наогул, павінен сказаць, што набор па спецыяльнасцях «рэжысёр масавых прадстаўленняў» і «кіраўнік самадзейнага тэатральнага калектыву» ў нас неблагі. Ёсць нямала таленавітых хлопцаў і дзяўчат. Многія з іх прыйшлі ў інстытут з мастацкай самадзейнасці. Праўда, у гэтым ёсць свае мінусы — у прыватнасці, набытыя штампы. Ад гэтага трэба адвучваць, прывіваць арганічнае пачуццё праўды, высокі мастацкі густ...

Як я ўжо казаў, наш інстытут рыхтуе рэжысёраў масавых прадстаўленняў, відовішчаў. Спецыяльнасць новая для рэспублікі. Група выкладчыкаў кафедры з'ездзіла па вопыт у Ленінградскі інстытут культуры, дзе выпускаюць спецыялістаў такога профілю. Сфера дзейнасці рэжысёра масавых прадстаўленняў? Наладжванне на высокім мастацкім узроўні святаў паэзіі, святаў ураджаю, пасвячэнняў у рабочыя і г. д.

На кафедры, якую ўзначальвае І. С. Папоў, працуе звыш 30 выкладчыкаў, у асноўным прафесіянальныя акцёры і рэжысёры... Студэнтам чытаецца той жа курс, што і ў тэатральным інстытуце з папраўкай на будучую спецыяльнасць — кіраўніка самадзейнага тэатральнага калектыву. Менавіта, не рэжысёра, а кіраўніка, які спалучае ў адной асобе і творчыя, і адміністрацыйныя функцыі.

Мы расказалі пра першыя творчыя пошукі пачаткоўцаў. А студэнты выпускнога чацвёртага курса рыхтуюць ужо дыпломныя спектаклі «Апошнія» М. Горкага, «Саламяны капялюш» Э. Лябіша, музычную кампазіцыю «Хатынь».

У той дзень мы пабывалі і на заліку, які здавалі студэнты па спецыяльнасці «харавое дырыжыраванне».

Першай у клас заходзіць студэнтка чацвёртага курса Людміла Мірончык. Высокая, стройная бялявая дзяўчына хвалюецца. Можна яе зразумець — яна павінна прадырыжыраваць фіналам першай дзеі оперы Даргамыжскага «Русалка». Прадырыжыраваць хорам, які існуе толькі ва ўяўленні. Фактычна трэба і спець за яго.

Па твары выкладчыка Уладзіміра Дзмітрыевіча Каструлёва, з якім яна рыхтавала гэтую праграму, відно, што Людміла нядрэнна спраўляецца з заданнем. Пасля студэнтка сама садзіцца за фартэпіяна і выконвае некалькі фрагментаў з той жа «Русалкі». Члены камісіі, якая прымае залік, задаюць студэнтцы пытанні па музычнай тэрміналогіі, па тэорыі музыкі, творчасці некаторых кампазітараў.

Залік здадзены. А перад камісіяй другая студэнтка — Галіна Карэлава, якая выконвае гапак з «Сарачынскай ярмаркі» Мусаргскага. Не за гарамі час, калі ёй прыйдзецца ўжо з хорам выступаць перад патрабавальнай аўдыторыяй слухачоў, дэманстраваць сваё майстэрства.

Пасля мы пагутарылі з абедзвюма студэнткамі. Людміла Мірончык — мінчанка, у інстытут прыйшла пасля заканчэння музычнай дзесяцігодкі. З дзіцячых гадоў захапляецца харавым спяваннем.

— Быць хормайстрам мая мара і хутка яна здзейсніцца, — гаворыць яна.

Галіна Карэлава — з Барысава. Прыйшла ў інстытут з мастацкай самадзейнасці, шмат гадоў спявала ў хоры.

Цяпер на факультэце культасветработы інстытута займаецца 432 студэнты. Акрамя спецыяльнасцей, пра якія мы ўжо расказалі, факультэт рыхтуе арганізатараў-метадыстаў клубнай работы, дырэктараў клубаў, палацаў культуры, кіраўнікоў аркестраў народных інструментаў.

— Вучэбныя планы складзены з такім разлікам, — расказвае дэкан факультэта, кандыдат мастацтвазнаўства Аляксандр Іванавіч Смагін, — каб даць студэнтам максімум ведаў. Напрыклад, яны слухаюць лекцыі не толькі па гісторыі мастацтваў, але і па аратарскім майстэрстве, вывучаюць асноўныя напрамкі навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, сацыяльную псіхалогію, краязнаўства, педагогіку і г. д.

Авалодваюць студэнты і кінапраекцыйнай тэхнікай.

Студэнты, якія набываюць музычныя спецыяльнасці, праходзяць курс спецыяльнай падрыхтоўкі ў аб'ёме кансерваторыі.

— У нас, — працягвае Аляксандр Іванавіч, — выдатныя ўмовы для заняткаў. Амаль увесь восьмы паверх адведзены для індывідуальных заняткаў музыкай. Да паслуг студэнтаў — 48 гукаізаляваных пакояў. Усе музычныя інструменты, у тым ліку фартэпіяна, высокай якасці, зроблены для нас па індывідуальных заказах.

Факультэт будзе расшыраны. Плануецца стварыць харэаграфічнае аддзяленне, якое будзе рыхтаваць кіраўнікоў самадзейных харэаграфічных калектываў.

Дарэчы, на факультэце створана свая мастацкая самадзейнасць. Заваяваў папулярнасць у горадзе інстытуцкі хор, танцавальны калектыў, эстрадны аркестр. Інстытуцкая агітбрыгада стала лаўрэатам міжрэспубліканскага конкурсу агітбрыгад. Яна часта выязджае з канцэртамі ў падшэфны Любанскі раён.

Чалавек, які скончыў самы вялікі, бібліятэчны факультэт — на ім займаецца каля 800 чалавек, павінен быць высокаадукаваным чалавекам. Вось чаму тут такая насычаная вучэбная праграма. Студэнты вывучаюць гісторыю рускай, беларускай, замежнай літаратуры, літаратуру дзіцячую і тэхнічную (чытаецца нават курс вышэйшай матэматыкі). У праграме ў шырокім аб'ёме грамадскія дысцыпліны, асновы прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, дзве замежныя мовы...

Цікава, што многія педагогі, якія цяпер працуюць на факультэце, у свой час самі закончылі яго. Гэта дэкан Васілій Емяльянавіч Лявончыкаў, кандыдаты навук Марыя Іванаўна Пакала, Раіса Аўрамаўна Ровіна і інш.

...Да позняга вечара свецяцца вокны інстытута. У чытальнай зале бібліятэкі, якая мае ўжо 100 тысяч кніг, у кабінетах і лабараторыях ідзе напружаная праца.

Кабінет тэхнічных сродкаў. На сталах кінапраектары. Будучыя бібліятэкары, культасветработнікі павінны валодаць і гэтай тэхнікай. Вось за першым сталом завіхаецца чарнявая дзяўчына. Гэта студэнтка чацвёртага курса бібліятэчнага факультэта Ірына Чыкіна. Расказвае, што сёння ўжо здала экзамен па англійскай мове. На «выдатна». Яе сяброўка па курсу Людміла Егерава, таксама паспяхова здала экзамен. Дзяўчаты мараць аб тым, часе, калі атрымаюць дыпломы і пойдуць працаваць па спецыяльнасці, якой вырашылі прысвяціць жыццё.

М. ЗАМСКІ.

Здае залік па харавому дырыжыраванню Людміла Мірончык.

А настрой у студэнтаў заўсёды добры.

Фота аўтара.

Шматфігурная кампазіцыя галоўнага манумента праекта помніка, аўтарам якога прысуджана I прэмія.

НА ШЛЯХАХ ПАМЯЦІ

Помнікі баявой славы... Звыш дзесяці тысяч гэтых сведкаў памяці людской знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі.

Манументальны летапіс подзвігу працягваецца, бо ніхто не забыты і нішто не забыта. Яшчэ адным сведчаннем гэтага з'явіўся конкурс на праект мемарыяльнага комплексу «Партызанская слава», які праводзіла Міністэрства культуры БССР.

Беларусь нездарма называюць маці-партызанкай. Сотні злучэнняў і атрадаў дзейнічалі на тэрыторыі рэспублікі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Беларускія партызаны многае зрабілі для агульнай перамогі. Зараз надышоў час вобразна асэнсаваць подзвіг народных мсціўцаў, стварыць мемарыял партызанскай славы.

Месца для мемарыяла выбрана ў прыгарадзе Мінска, ля станцыі Крыжоўка. Яно выбрана не выпадкова — зручная транспартная даступнасць, знаходжанне гэтага ўчастка ў міжраённай зоне адпачынку. Не апошнюю ролю ў выбары пляцоўкі адыгралі і ландшафтныя асаблівасці мясцовасці — выразны рэльеф з дамініруючым узгоркам, які знаходзіцца паміж чыгункай і шашой, наяўнасць лесу.

Днямі падведзены вынікі конкурсу на праект комплексу «Партызанская слава».

Першую прэмію атрымаў праект пад дэвізам «1941-45 (чырвоны)». Кіраўнікі праекта: А. Анікейчык, Ю. Градаў, Л. Левін, М. Данцыг; архітэктары І. Дзятлаў, І. Пілатовіч.

Другая прэмія прысуджана праекту, які быў прадстаўлены пад дэвізам 1941-45 (чорна-белы). Аўтары праекта: Ю. Шпіт, А. Кішчанка, М. Савіцкі; выканаўцы В. Карака, А. Панамароў, Ул. Старчанка (пры ўдзеле В. Ачайкіна).

Маладзёжнаму калектыву, які прадставіў праект пад дэвізам: 414475, прысуджана трэцяя прэмія. У гэты калектыў увайшлі М. Ткачук, М. Андрэеў, В. Фёдараў, М. Дубоўскі, С. Кожар, С. Мурзаў, Н. Чыл-Акапян, М. Яркоў.

Аўтарам праекта, якія атрымалі першую прэмію, даручана далейшая распрацоўка праекта мемарыяльнага комплексу.

Нядаўна конкурсныя праекты комплексу дэманстраваліся ў Мінскім Палацы мастацтваў. Раскажам жа больш падрабязна аб праекце, які ўдастоены першай прэміі.

Лаканічнае, яснае рашэнне генеральнага плана мемарыяльнага комплексу. Наведвальнік з прыпынку транспарту трапляе на плошчу Міру — сімвал мірнага стваральнага жыцця. На далейшым шляху рэзкім кантрастам з папярэднім паўстае кампазіцыя «Рэха вайны» — асколкі бомбаў і снарадаў, якія ўрэзаліся ў жытнёвае поле. Гэта вобразны нагамінак аб пачатку вайны, аб пачатку барацьбы і выпрабаванняў.

Далей з невялікай уваходнай плошчы пачынаецца «дарога ў партызаны», якая ідзе па гаці праз балота, праз лес. Сцяжынкі, як ручайкі ў русла ракі, сцякаюцца ў адзіны шлях — шлях народнай барацьбы.

Дарога прыводзіць на плошчу герояў - партызан. З плошчы — уваход у пантэон партызанскай славы, які з'яўляецца асноўным элементам усяго ансамбля. Пантэон накіроўвае да партызанскай зямлянкі. Верхні пяцігранны ярус пантэона запоўнены манументальным роспісам на тэму гераічнай барацьбы партызан. Ніжні ярус — «вянец славы». Тут пералічаны ўсе партызанскія злучэнні і атрады, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі.

Пасярэдзіне пантэона гарыць партызанскі касцёр — касцёр славы. Ён гарыць на магіле невядомага партызана, дзе мы чытаем словы: «Радзімы сын, подзвіг твой вечны ў сэрцы народа». Гэтая кампазіцыя — кульмінацыйная вяршыня ансамбля.

Над галоўным уваходам у пантэон — дзесяціметровая шматфігурная скульптура «Сям'я» — сімвал усенароднасці барацьбы з захопнікамі. Пантэон мае два бакавыя выхады: адзін з іх раскрываецца на кампазіцыю «Рэйкавая вайна» і візуальна звязаны з чыгункай.

Праект пакідае ўражанне прадуманасці, сур'ёзнага і цікавага падыходу да раскрыцця тэмы. Адчуваецца імкненне аўтараў вобразна і паэтычна вырашыць увесь ансамбль; у асноўным гэта ўдалося, хоць прыкметны і некаторыя недахопы. Так, «дарога ў партызаны» недастаткова эмацыянальна падрыхтоўвае гледача да ўспрымання асноўнай кампазіцыі мемарыяла — пантэона, не прадуманы кампазіцыйныя і візуальныя сувязі ансамбля з транспартнымі камунікацыямі. З гэтага пункту гледжання не зусім задавальняе фармальнае рашэнне скульптурнай кампазіцыі над галоўным уваходам у пантэон.

Есць надзея, што пры далейшай дапрацоўцы гэтай тэмы — з улікам думкі грамадскасці і прафесіянальнага аналізу — беларускі манументальны летапіс бессмяротнага подзвігу народа папоўніцца значным архітэктурна-мемарыяльным комплексам глыбокага эмацыянальнага гучання.

У. МАРОЗ, М. ДЗЯТКО,
архітэктары.

Пантэон мемарыяльнага комплексу «Партызанская слава», праект якога атрымаў II прэмію.

Агульны выгляд мемарыяльнага комплексу «Партызанская слава» (праект. На конкурсе — III прэмія).

Віталій ЧАЦВЕРЫКОЎ, сакратар праўлення Саюза кінематаграфістаў БССР:

«СУЧАСНІКА—БУЙНЫМ ПЛАНАМ»

11 лютага пачынае работу чарговы IV з'езд Саюза кінематаграфістаў Беларусі. Ён адбываецца ў атмасферы ўсенароднага ўздыму, выкліканага гістарычнай падзеяй — падрыхтоўкай краіны да XXV з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. У мастацтве кожны агляд зробленага за пэўны тэрмін убірае ў сябе і калектыўны роздум творчых работнікаў аб шляхах мастацтва сацыялістычнага рэалізму, яго сучасных тэндэнцый, здабыткаў і выдаткаў. Трэба спадзявацца, што беларускія кінематаграфісты павядуць размову аб экранным мастацтве на такой прынцыповай аснове. Яны дадуць бескампрамісную ацэнку фільмам, пастаўленым на студыі «Беларусьфільм» ва ўсіх яе вытворчых аб'яднаннях. У прыватнасці, заслугоўваюць увагі нядаўнія па тэрмінах падрыхтоўкі мастацкія стужкі (сярод іх — «Час яе сыноў», «Сын старшыні»), хранікальна-дакументальныя і прызначаныя для тэлевізійнага экрана творы.

Напярэдадні IV з'езда работнікаў кіно Беларусі карэспандэнты штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» звярнуліся да сакратара Саюза кінематаграфістаў рэспублікі, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Віталія Чацверыкова з просьбай падзяліцца роздумам пра маючы адбыцца форум работнікаў кіно.

—ПАЧАЎСЯ год асаблівы, год адказны, — падкрэсліў В. Чацверыкоў, — бо ён знамянуе сабой і пачатак дзесятай пяцігодкі, і набліжэнне ўжо шасцідзесятай гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. У календарах ён будзе пазначаны і як год XXV з'езда КПСС. Усё гэта надае часу, у які мы жывём, рысы неаўторныя, і ўскладае на мастакоў надзвычай адказны абавязак — працаваць па вышэйшых ідэйна-творчых крытэрыях.

Зразумела, калі рэжысёр або артыст, аператар ці сцэнарыст ажыццяўляюць свае задумы, робяць фільм, яны бываюць захоплены высакароднай задачай: дасягнуць пэўнага ўзроўню якасці. З асобных намаганняў і асобных стужак фарміруецца аблічча вялікага калектыву — студыі і наогул нацыянальнага кінематографа.

Вось пра гэта і варта нам сур'ёзна пагаварыць на сваім форуме. Як пераадолець цэхавую замкнёнасць і абмежаванасць і выйсці ў вялікае жыццё краіны, у дыялектычна складаны свет людскіх узаемаадносін у эпоху інтэнсіўнага развіцця тэхнікі, агульнага адукацыйнага цэнзу, эмацыянальна-маральнага пасталення грамадства, — гэта наш клопат, аб якім нельга не гаварыць на з'ездзе. Бывае, асобныя «звенні» агульнага творчага і вытворчага ланцуга (я маю на ўвазе вытворчую студыю, творчы саюз і грамадскія арганізацыі) нібы адрываюцца адзін ад аднаго. Між тым, поспеху ў паказе сучасніка і інтэрпрэтацыі мінулага можна дасягнуць толькі агульнымі сіламі. І ў гэтым напрамку — кансалідацыі беларускіх кінематаграфістаў—нашаму з'езду ёсць што абмеркаваць.

Думаю, з яго трыбуны прагучыць наш клопат і пра крытыку. Не толькі ў рэцэнзенцкім або даследчым яе аспектах, а і ў агульнай атмасферы творчага жыцця. Нам час ужо навучыцца ацэньваць зробленае па сапраўдных вартасцях, пакласці канец дыпламатычнаму замоўчванню твораў шэрых, ідэйна і па-мастацку збедненых, драбнатэмных і нізкіх па прафесіянальнаму майстэрству. Масавы глядач хутка забывае нават назвы такіх стужак, што сплылі ў нябыт і захоўваюцца на паліцах кінапракатных устаноў. Нам забывацца на гэта нельга. Грамадзянскае сумленне абавязвае нас на ўвесь голас гаварыць і пра аўтараў нізкапробных карцін, і аб тых прычынах, якія даюць магчымасць некаторым работнікам даводзіць да экрана загадзя ясную для ўсіх кінематаграфічную пасрэднасць. Калі чалавек прысвячае сябе экраннаму мастацтву, яго абавязкі перад дзяржавай і партыяй толькі ўзнімаюцца. Бо нічога няма горшага за мастацкі брак, за нізкую якасць у творчасці.

Вядома, я маю на ўвазе безумоўную хэлтуру і прымітыў, адрозніваючы ад іх творчыя пралікі, дапушчаныя ў сапраўдным пошуку.

Пастанова ЦК КПСС «Аб мерах па далейшаму развіццю савецкай кінематаграфіі» дакладна акрэсліла задачы творчага аб'яднання работнікаў экраннага мастацтва. Там было сказана так: «Саюз кінематаграфістаў СССР не выкарыстоўвае ўсіх маг-

ДЭБЮТ

НОВАЕ Ў ЗНАЁМЫМ

«ПРАД'ЯВІЦЕ ПРОПУСК» Я. ШАБАНА У БРЭСЦКІМ ТЭАТРЫ імя ЛЕНІНСКАГА КАМСАМОЛА БЕЛАРУСІ

КАЛІ глядзіш гэты спектакль, то пазнаеш на сцэне адбітак рэальнага жыцця. Здаецца, што і тэматычна ён паўтарае знаёмыя табе тэатральныя версіі той жыццёвай гісторыі, дзе малады чалавек нашых дзён самастойна адкрывае для сябе сапраўдныя маральныя каштоўнасці, блукаючы і намыляючыся, ідзе да ісціны. Сапраўды, інжынер Клім Сухін, канечне, ведае, «што такое добра» і «што такое дрэнна», прагне гармоніі паміж сваім ідэалам і абавязкам. Але выбірае шлях даволі парадаксальны: ён працуе радавым апаратчыкам у цэху буйнага прадпрыемства, заваёўвае права быць перадавіком сярод рабочых, каб здабыць для сябе розныя выгоды. Ён ездзіць у замежныя камандзіроўкі, выступае на розных сімпозіумах, засядае ў прэзідыумах, і гэта яму вельмі дорага, гэта «прэстыжна». Клім Сухін здзіўляе і крыўдзіць сваіх сяброў, у прыватнасці, майстра цэха Віталя, абражае пачуцці каханай Зосі. Чым больш у яго славы сярод тых, хто не ведае яго блізка, тым вастрэйшы канфлікт з сябрамі і калегамі па брыгадзе.

Інжынерскі дыплом у кішэні рабочага — гэта для Кліма і ёсць арыгінальная пазіцыя, гэтым ён і «вылучае» сябе. Навошта?

І яшчэ пытанне, якое гучыць са сцэны і адрасуецца не толькі герою спектакля, а і глядзельнай зале: што вышэй для чалавека — поспех, здабыты любым коштам, ці спалучэнне асабістых інтарэсаў з грамадскімі? Калі другое, то малады спецыяліст павінен «адбыцца» як сучасная паўнацэнная асоба па «сваім» месцы, даваць людзям максімум са сваіх ведаў і здольнасцей.

Пытанні гучаць са сцэны — так пабудаваны спектакль рэжысёрам М. Кавальчыкам. Персанажы то звяртаюцца ў залу, то каменціруюць дзею, то завязваюць дыялог з іншымі героямі «па ходу» сюжэтных перыпетый. Гледачы становяцца ўдзельнікамі дыспута. І застаюцца гледачамі, бо сюжэт развіваецца, у Кліме Сухіну адбываюцца змены, ён паступова вызваляецца з-пад панцыра эгацэнтрызму, пачынае бачыць блізкіх людзей без сваіх «акуляраў» кар'ерыста.

Таксама знаёмая драматургічная і тэатральная трактоўка маладзёжнай тэматыкі: малады кар'ерыст пераадольвае штосьці ў сабе, вызваляецца ад заганаў. Разам з тым аўтар п'есы і рэжысёр даследуюць знаёмую праблематыку на новым жыццёвым матэрыяле і ў новай сцэнічнай трактоўцы. І спектакль глядзіцца, абуджае жаданне памагчы такім, як Клім Сухін.

Спектакль «Прад'явіце пропуск» па п'есе Яўгена Шабана — дэбют драматурга па сцэне. Ці маем мы права гаварыць «драматурга», калі ў святло рампы трапіла першая або другая п'еса? У дадзеным выпадку маем, бо Я. Шабан — прафесіянальны літаратар і кінематаграфіст. Зварот такога чалавека да драматургіі не выпадковы. Цяпер ён упершыню ўбачыў сваіх літаратурных герояў дзеючымі на сцэне. Раней ён выступаў інсцэніроўшчыкам, аўтарам лібрэта паводле вядомых твораў. Праўда, не паспелі яшчэ адшумець апладысменты ў Брэсце пасля прэм'еры, як тэатр юнага гледача пазнаёміў гледачоў Мінска яшчэ з адным творам для сцэны таго ж аўтара «Сіні снег». Зразумела, гаварыць трэба і пра гэта, але ж дэбют адбыўся ў Брэсце...

Дзеянне «Пропуска...» разгортваецца ў нашы дні на фантастычным па сваім размаху сучасным камбінаце. Матэрыялам для драматургічнага асэнсавання аўтару служылі ўражанні ад Магілёўскага камбіната сінтэтычнага валакна, на якім ён бываў неаднойчы. Канфлікт, які ляжыць у аснове п'есы, —актуальны. Аўтар сцвярджае, што такія заганы, як абыякавасць да чалавека і кар'ерызм прыносяць найбольшае зло, калі іх носьбітамі з'яўляюцца людзі, што на свайму становішчу ў жыцці павінны быць асабліва высакамаральнымі.

Тэатр карыстаецца кожным кампанентам сцэнічнага відовішча, каб перадаць рэальнасць таго, што адбываецца ў асяроддзі маладых спецыялістаў і рабочых. Рэжысура не адмаўляецца і ад умоўных прыёмаў. Ёсць эпізоды сапраўды дасціпныя, займальныя, ёсць і сумнаватыя (акурат тады, калі знаёмае і выглядае знаёмым, без навізны). Добра, што Я. Шабан напісаў і выканаўцы захавалі жывую мову персанажаў, якая памагае стварыць індывідуальныя характары. Праўда, сустракаюцца і ў мове шаблонныя канструкцыі фраз, знарок «гутарковыя» звароты, што пазбаўляе асобныя сцэнкі такой важнай якасці, як мастацкая прафільтраванасць пачутага на вуліцы або ў цэху.

Добра, што тэатр не спакусіўся магчымасцю размеркаваць па-плакатнаму фарбы паміж станоўчымі і адмоўнымі персанажамі. Сімпатыі да Кліма Сухіна захоўваюцца і тады, калі яго пазіцыя яўна памылковая. Штосьці застаецца ў гэтай асобе, што абяцае не такую просталінейную перабудову маральных прынцыпаў.

У спектаклі двое вядучых: Аўтар і Слушок-чалавек. Гэта два супроцьлеглыя погляды, дзве пазіцыі ў жыцці, і на працягу ўсяго спектакля паміж імі ідзе спрэчка. Адно і тое ж яны ўспрымаюць зусім па-рознаму. Слушок-чалавек бачыць усё ў цынічным святле, і абодва выканаўцы гэтай ролі—А. Самараў і В. Кастэльцаў — малююць свой персанаж сатырычнымі, нават з'едлівымі фарбамі. Гэта зусім слушна і ўнутрана апраўдана, хоць з цягам часу і выглядае трохі аднастайна. Аўтар у артыста Ю. Уласава стараецца быць аб'ектыўным, каменціруючы падзеі, задаючы пытанні героям і глядзельнай зале.

П'еса вымагае, каб на сцэне была створана атмасфера вялікага сучаснага прадпрыемства. Спрыяе дасягненню гэтай мэты сцэнаграфія Ю. Тура. Мастак фарміруе асяроддзе пры дапамозе промняў-ніцей (нібы матэрыялізаванага святла) па ўсёй прасторы сцэны і высокіх шчытоў на заднім плане, якія выконваюць розныя функцыянальныя задачы (напрыклад, дзвярэй, што адчыняюцца і зачыняюцца, надаючы дзеянню дадатковую дынаміку).

Ёсць гэтая дынаміка і ў героях спектакля. Выканаўца галоўнай ролі Кліма І. Мацкевіч іграе чалавека самаўпэўненага, які цвёрда стаіць на зямлі, спачатку непахісна верыць у правільнасць таго, што робіць. Гэты Клім —упартая сіла, з якой іншым дужацца цяжка, але неабходна. Праўда, часам акцёр так падае адкрытае хамства персанажа ў адносінах да сяброў, што герой робіцца «больш» адмоўным, чым напісаны драматургам. Нейкая зададзенасць адчуваецца ў такой трактоўцы. Ды і «перабудоўваецца» такому Кліму даводзіцца надта ж рашуча, кардынальна. Аб запасе добрага ў яго душы здагадваешся далёка не адразу, бярэш пачуцці Зосі пад сумненне. (Іншы выканаўца ролі Кліма А. Караткевіч пакідае больш указанняў на патэнцыяльную гатоўнасць героя «перайсці» на процілеглы бераг...). Маладзейшым за таго Віталя, што напісаны драматургам, паказваюць яго В. Залатухін і А. Гаманюк. І словы пра абавязак чалавека, пра сумленне гучаць хутчэй з рамантычным адценнем юнацтва, чым з прынцыповых пазіцый, як гэта напісана ў п'есе. Таму трапнай характарыстыкай з'яўляюцца ў спектаклі словы Мікалая Мікалаевіча (А. Грозеў) аб Віталю: «Вы як быццам па падручніку жывяцё...» Сапраўды, уражанне такое, што сцэнічны Віталь у Брэсце з падручнікамі расстаўся нядаўна. І ў спрэчцы з Клімам яго галоўны козыр — палкасць, чысціня юнай душы. Такі акцэнт не збядняе драматургічную аснову ролі, надае канфлікту вастрыню.

Наогул у спектаклі ёсць шэраг псіхалагічна глыбокіх акцёрскіх работ: М. Магілеўскі (Бягуноў), А. Бержной (Іван Пятровіч), М. Перапечка (Яша), Э. Кавальчык (Зося), С. Юркевіч (чалавек «пад мухай»). Дарэчы, апошняя фігура —эпізадычная. Але чалавек «пад мухай» сыграны С. Юркевічам так, што спачатку ён здаецца смешным і нават мізэрным. Паступова акцёр раскрывае ўнутраную трагедыю асобы заняпалай, што ўсведамляе сваё падзенне. Уражанне ўзмацняецца яшчэ дзякуючы песні, якую пранікнёна выконвае С. Юркевіч (напісаную самім акцёрам). Горні, крыўдны «варыянт» чалавечага лёсу псіхалагічна вельмі абгрунтаваны.

Гледачы ўспрымаюць спектакль як размову аб сумленні і прынцыповасці, аб месцы чалавека ў калектыве, аб шчасці, якое трэба шукаць і за якое трэба змагацца, аб сапраўдных каштоўнасцях. Дэбют паэта Я. Шабана ў драматургіі адбыўся. Вечары, калі ў Брэсце ідзе яго п'еса, пацвярджаюць гэты прыемны факт.

Яўгенія БАРЫСАВА.

Артысты А. Караткевіч, Э. Кавальчык і А. Гаманюк у ролях Кліма Сухіна, Зосі і майстра цэха Віталя.

Фота В. ЧАБЕРКУСА.

З розных шырот

МНР: кнігі 1976 года

— Наша праграма на 1976 год, — сказаў у гутарцы з карэспандэнтам ТАСС галоўны рэдактар дзяржаўнага выдавецтва МНР Т. Саднамдоржа, — перавышае па аб'ёму мінулагоднюю. А ў 1975 годзе мы выпусцілі ў свет звыш 500 выданняў агульным тыражом больш чым 5 мільёнаў экземпляраў.

Змест грамадска-палітычнай літаратуры, якая будзе выдавацца ў 1976 годзе, у многім вызначаецца яго найбольш значнымі падзеямі. Гэта — чарговыя з'езды КПСС, МНРП, іншых братніх камуністычных і рабочых партый, 55-я гадавіна МНР. Дакументы і матэрыялы партыйных з'ездаў будуць выпушчаны на мангольскай мове масавымі тыражамі.

Значнае месца ў плане мангольскіх выдавецтваў, як і раней, займаюць падрыхтоўка і выпуск прац заснавальнікаў марксізму-ленінізму. Сёлета выйдуць у свет трэці том выбраных твораў У. І. Леніна; два зборнікі, куды ўвойдуць творы Маркса, Энгельса, Леніна аб літаратуры, рэлігіі. Некалькі манаграфій прысвечана гістарычнаму вопыту развіцця МНР, дзейнасці МНРП па кіраўніцтву будаўніцтвам сацыялізму ў МНР.

Сучасная мангольская літаратура ў планах выдавецтва прадстаўлена творамі ўсіх жанраў, аўтарамі старэйшага і маладога пакалення. Будзе выпушчана больш чым 50 тамоў мангольскай мастацкай прозы, паэзіі, драматургіі, а таксама крытыкі і мастацтвазнаўства. Багатая і тэматыка новых твораў. У іх аднаўляюцца старонкі рэвалюцыйнай барацьбы народа, адлюстравана жыццё маладога рабочага класа, наватарства, думы народнай інтэлігенцыі.

У лістападзе грамадскасць краіны ўрачыста адзначыць 70-годдзе з дня нараджэння заснавальніка сучаснай мангольскай літаратуры Д. Нацагдоржа. Будуць перавыдадзены яго творы.

Сярод навінак цікавы зборнік вершаў і расказаў Д. Нацагдоржа на англійскай мове. Дарэчы, выданне мангольскіх народных казак і твораў вядучых нацыянальных пісьменнікаў на англійскай мове ўпершыню ажыццёўлена сіламі мангольскіх перакладчыкаў і мясцовых выдаўцоў.

Цікавасць да савецкай літаратуры ў Манголіі велізарная. Таму зусім натуральна, што значная частка выпускаемых мясцовымі выдавецтвамі кніг — гэта творы шматнацыянальнай савецкай літаратуры. Прычым характэрна, што мангольскія перакладчыкі ажыццяўляюць пераклад непасрэдна з мовы арыгінала — рускай, казахскай, бурацкай, калмыцкай і г. д. Сам гэты факт сведчыць аб растучым майстэрстве перакладчыкаў.

Дзякуючы гэтаму мангольскія чытачы знаёмяцца з рускай і сазенкай класікай, творамі пісьменнікаў нацыянальных рэспублік і абласцей Савецкага Саюза, краін сацыялістычнай садружнасці. У плане гэтага года — творы такіх пісьменнікаў, як Горкі, Бунін, Герцэн, а таксама І. Мележ, А. Ганчар, Ш. Рашыдаў, Ю. Сямёнаў і інш.

Дзяржаўнае выдавецтва МНР ажыццяўляе выпуск «Бібліятэкі Перамогі». Вялікай папулярнасцю ў мангольскіх чытачоў карыстаецца «Аповесць пра сапраўднага чалавека» Б. Палявога, якая выйшла ў мінулым годзе другім выданнем. З гэтай серыі сёлета ўбачаць свет «Страчаны прытулак» І. Авіжуса, «Сцяганосцы» А. Ганчара, а таксама творы Ганны Зэгерс, Я. Отчэнашэка (ЧССР), Е. Анджэйускага (Польшча).

Мы расказалі пра планы вядучага выдавецтва МНР. Нямала цікавых твораў айчыннай і зарубежнай літаратуры выпусціць выдавецтва міністэрства народнай адукацыі МНР, якія спецыялізуюцца на выданні кніг для дзяцей і юнацтва.

К. БАЛДАХОНАЎ.
кар. ТАСС.

Улан-Батар.

СІЯНІЗМ—ГЭТА САПРАЎДНЫ РАСІЗМ

Рэзалюцыя Генеральнай Асамблеі ААН, у якой асуджаецца сіянізм, як адна з форм расізму і расавай дыскрымінацыі, выклікала шырокі водгук сусветнай грамадскасці. Гэтую акцыю ўплывовага сусветнага форуму грамадскасць расцэньвае як правільную і своечасовую. У стане ж сіяністаў і іх імперыялістычных прыхільнікаў гэтае рашэнне ААН было сустрэта ў штыкі. У адносінах краін, якія галасавалі за яго, прадстаўнікі Ізраіля, ЗША і шэрагу іншых заходніх дзяржаў як з трыбуны ААН, так і на розных канферэнцыях і прэс-канферэнцыях прадпрымалі злосныя нападкі, не скупіліся на лаянку і знявагі. Яны ахарактарызавалі гэтае рашэнне як «абсурднае». А пастаянны прадстаўнік ЗША пры ААН Д. Майніхэн не пасаромеўся перад прадстаўнікамі больш чым 100 краін свету назваць рэзалюцыю ААН «больш чым бессаромнай».

Асаблівую лютасць — і гэта не выпадкова — рэзалюцыя ААН выклікала ў Ізраілі. Прэм'ер Рабін, міністр замежных спраў Алон і іншыя правіцелі Ізраіля абрушылі літаральна патокі бруду на галовы прадстаўнікоў тых 72 дзяржаў, якія галасавалі ў падтрымку рэзалюцыі. У знак пратэсту супраць рашэння ААН галоўная вуліца ў Іерусаліме была перайменавана ў «Дарогу сіянізму». Па ёй хадзілі малодчыні з экстрымісцкіх груп са значкамі «Я — сіяніст». Гэтая неразумная і недарэчная дэманстрацыя паказвае, што правячыя колы Ізраіля няздольны зрабіць правільных высноў з асуджэння іх тэорыі і практыкі. Гэта не першы выпадак ігнаравання Ізраілем рашэнняў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Аднак праз некаторы час у шэрагу органаў заходняга друку з'явіліся артыкулы, аўтары якіх спрабуюць разабрацца ў прычынах, якія прымусілі сусветнае таварыства нацый асудзіць дактрыну сіянізму. Нават вядомыя сваімі сімпатыямі да сіяністаў газета «Н'ю-Йорк таймс» вымушана была, хоць і з агаворкамі, прызнаць справядлівасць рэзалюцыі, у якой, паводле яе слоў, «закладзены элемент ісціны». Газета прама ўказвала, што ў Ізраілі, арабская меншасць разглядаецца як «грамадзяне другога гатунку».

«Алія» — іміграцыя ў Палесціну — заўсёды была галоўным лозунгам сіяністаў, якія імкнуліся стварыць там «чыстую» ў расавых адносінах дзяржаву, якая, паводле слоў вядомага кіраўніка сіяністкага руху Хаіма Вейцмана, павінна стаць «такой жа еўрапейскай, як Англія—англійскай».

Яшчэ да другой сусветнай вайны сіяністкія лідэры пачалі праводзіць палітыку захопу арабскіх зямель і перасялення яўрэяў з іншых краін на «зямлю абетаваную»—Палесціну, якая з даўніх часоў была заселена арабамі. Аднак палесцінскія арабы не мелі сваёй дзяржавы і знаходзіліся спачатку пад турэцкім уладарствам, а затым пад мандатам Англіі. Пасля ўтварэння дзяржавы Ізраіль у 1948 годзе сіяністкая вярхушка, прыбегнуўшы да жорсткага тэрору, дабілася «зыходу» палесцінскіх арабаў з займаемых зямель. Больш паўтара мільёна палесцінскіх арабаў беглі з родных месц і жывуць цяпер у лагерах у суседніх арабскіх дзяржавах. У арабскага насельніцтва былі экспрапрыіраваны дзесяткі тысяч акраў зямлі.

Лідэр ізраільскіх сіяністаў, першы прэм'ер-міністр Ізраіля Бен-Гурыён указываў: «Мы павінны зрабіць усё магчымае для таго, каб арабы ніколі не вярнуліся».

Сіяністкая палітыка тэрытарыяльнай экспансіі і выгнання арабскага насельніцтва з Палесціны працягваецца і зараз. Як заявіў яшчэ ў 1968 годзе цяперашні міністр замежных спраў І. Алон, «наш абавязак засяліць «Вялікі Ізраіль» не менш важны, чым абавязак у мінулым, у дні мандата — засяліць даліну Іардана і даліну Бет-Шана. Той, хто ставіць пад сумненне гэтую ісціну, ставіць пад пытанне ўсю сіяністкую канцэпцыю». А намеснік спікера кнесета (парламента) Ізраіля Бен-Порат катэгарычна адвяргае ўсялякую магчымасць для палесцінскіх бежанцаў вярнуцца ў Ізраіль нават пры ўмове ўрэгулявання блізкаўсходняга канфлікту. Свае міфічныя правы на Палесціну сіяністкія лідэры не могуць абгрунтаваць нічым, акрамя спасылак на біблейскія паданні.

У самым Ізраілі расавыя бар'еры ўзведзены паўсюль. У гэтых адносінах дзяржава Ізраіль мала чым адрозніваецца ад расісцкай Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі. 400 тысяч арабаў, якія засталіся ў Ізраілі, гібеюць. Яны падвяргаюцца ва ўсім пастаяннай дыскрымінацыі.

«Абраны богам» народ Ізраіля таксама дзеліцца на некалькі катэгорый: «сабра» — яўрэі, якія нарадзіліся ў Ізраілі, і «ашкеназі»—яўрэі, якія прыбылі з Заходняй Еўропы і ЗША, — гэта прывілеяваныя людзі. Становішча «сефардаў» — азіяцкіх і афрыканскіх яўрэяў і яўрэяў —выхадцаў з краін усходняй Еўропы мала чым адрозніваецца ад становішча арабаў. Расізм ярка праяўляецца ў Ізраілі і ў адносінах змешаных шлюбаў. Голда Мэір, якая доўгі час узначальвала ўрад, заявіла, што для Ізраіля «змешаны шлюб — самая вялікая небяспека». Дзяленне яўрэяў у еўрапейскай дзяржаве на «чыстых» і «нячыстых» — хіба гэта не сапраўдны расізм!

Ізраільскае грамадства глыбока паражона мілітарызмам, сіяністкім шавінізмам, якія ўеліся ва ўсе яго поры. Усе сродкі масавай прапаганды не толькі ў палітычнай, але і культурнай галінах накіраваны на ўнушэнне маладому пакаленню пачуцця перавагі ў адносінах да арабаў. Нездарма ў анкеце газеты «Гаолам газе» са ста апытаных пяцёра прапанавалі трымаць прадстаўнікоў арабскай меншасці Ізраіля ў канцэнтрацыйных лагерах, а 95 выказаліся за розныя формы іх фізічнага знішчэння.

Некаторыя цвярозыя розумы ў Ізраілі ўказвалі, што тыя, хто насаджае расізм і насілле сярод моладзі, даб'юцца, што грамадства будзе пазбаўлена маральных каштоўнасцей. Сёння такое грамадства ўжо фарміруецца. Настрой песімізму і безнадзейнасці, паўсюдная карупцыя паразілі не толькі вышэйшыя, але і сярэднія слаі ізраільскага грамадства, багацце зброі ў краіне прывяло да росту гангстэрызму. Злачынасць значна вырасла, і паліцыя Ізраіля, паводле прызнання яе кіраўніцтва, не можа кантраляваць становішча.

Такія горкія вынікі ідэалагічнага, палітычнага і культурнага расізму, насаджаемага ў Ізраілі, таго расізму, існаванне якога імкнуцца абвергнуць апалагеты сіянізму і іх заходнія адвакаты.

Ю. ТЫСОЎСКІ.
(ТАСС).

ЧАЛАВЕК ПЯРЭДНЯГА КРАЮ

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 12—13).

Па сутнасці, у рамане А. Каштанава «выпрабоўваецца» гераіня і вытворчасцю, работай, і побытам, сямейнымі ўзаемаадносінамі. І хоць «апалогію сям'і» наогул у наш час, калі ўсё больш распадаецца сем'яў, калі сацыёлагі імкнуцца даследаваць прычыны гэтага, можна толькі вітаць, трэба адзначыць, што ў дадзеным канкрэтным выпадку пастаянную кампраміснасць, на якую ідзе гераіня нельга лічыць станоўчым вырашэннем сямейных адносін. Па сутнасці Брагіна не вытрымлівае «выпрабавання» побытам. У падобнай сітуацыі герой рамана І. Шамякіна «Атланты і карыятыды» Карнач, парываючы з жонкай і з тым мяшчанскім балотам, у якое яна яго ўвагнула мае большае права лічыцца пераможцам, станоўчым героем. Творы І. Шамякіна, А. Каштанава і многія іншыя сведчаць аб вялікай увазе прозы да складаных сацыяльна-маральных, псіхалагічных асноў сучаснай сям'і.

Раман А. Каштанава, думаецца, сведчыць яшчэ аб плённых пошуках «вытворчай» прозы і разам з тым аб вялікіх, не заўсёды і не ва ўсім яшчэ пераадоленых цяжкасцях, якія паўстаюць перад пісьменнікамі, асабліва ў імкненні цэласна і арганічна паказаць нашага сучасніка, яго вытворчае, грамадскае і інтымнае жыццё.

Сучасная беларуская проза яшчэ мала мае такіх твораў, дзе ёсць сапраўды мастацкія маштабныя буйныя характары-тыпы нашых сучаснікаў. Найбольш цяжкім для яе з'яўляецца іменна паказ таго, як навукова-тэхнічная рэвалюцыя, істотныя, жыватворныя змены ва ўсім нашым сацыяльным і эканамічным жыцці ўплываюць на характар і светаразуменне, мараль і этыку нашага сучасніка. Бо для мастацкай літаратуры галоўнае не ў адлюстраванні саміх па сабе працэсаў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, а ў паказе таго, які адбітак яна знаходзіць у чалавеку, яго грамадскай, гуманістычнай сутнасці.

Пашырэнне рацыяналізму, высокі інтэлектуальны ўзровень асобы дапамагаюць ёй глыбей усведамляць сябе як чалавека, дапамагаюць пазбаўляцца прымітывізму, наіўнага інфантылізму. Па сутнасці размова ідзе аб тэндэнцыях інтэлектуалізацыі літаратуры ў шырокім сэнсе слова, звязанай з навукова-тэхнічнай рэвалюцыяй і сацыяльным прагрэсам, пашырэннем адукацыі і культурай мыслення.

Праўда, нярэдка інтэнсіўнасць перажыванняў, пачуццяў не праяўляецца, не дэманструецца знешне, хоць ад гэтага не становіцца слабейшай, збяднеўшай. Сучасны чалавек пры ўсёй знешняй стрыманасці жыве багатым унутраным рацыянальным і эмацыянальным жыццём, імкнецца да ўстойлівай гармоніі ўсяго духоўнага жыцця. Таму пісьменнікі акцэнтуюць увагу на важнасці арганічнага адзінства інтэлекту з высокай маральнасцю. Нават звяртаючыся да сферы побыту, сям'і, інтымных адносін, яны імкнуцца выявіць тое, як НТР уплывае не толькі на інтэлект, свет рацыяналізму, але і на свет пачуццяў, эмоцый, узбагачаючы яго. Вядома, побач з гэтым існуе і голы прагматызм, які душыць любыя эмоцыі, нават каханне, калі яны ідуць на шкоду яго практычным, утылітарным мэтам, мэтам «разумна» жыць.

Аднак сучасны чалавек, асоба ў вышэйшай ступені інтэлектуальная, багатая духоўна, у імкненні да шырокага і глыбокага самавыяўлення свайго інтэлекту, сапраўды часта найбольш свабодна і поўна выяўляецца у паўнаводнай плыні ўнутранага эмацыянальна - псіхалагічнага і разумова-інтэлектуальнага жыцця.

Гэтага не можа не ўлічваць сучасная літаратура. Характар нашага сучасніка цяжка выявіць у поўным аб'ёме праз дзеянне і дыялог, патрэбен псіхалагічна тонкі аналіз яго ўнутранага жыцця, раскрыццё яго душы знутры, патрэбна сапраўднае майстэрства раскрыцця «дыялектыкі душы» чалавека ў самых разнастайных сферах яго жыццядзейнасці.

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ КАНСЕРВАТОРЫЯ

імя А. В. ЛУНАЧАРСКАГА

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС

на замяшчэнне вакантнай пасады прафесарска-выкладчыцкага складу па кафедры харавога дырыжыравання — старшы выкладчык — 1

Заяву і дакументы, згодна з Палажэннем аб конкурсе, накіроўваць на імя рэктара па адрасу: г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30.

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання.

Даведкі па тэлефонах: 22-49-42; 22-96-71.

СУСТРЭЧЫ, ПОШУКІ, АДКРЫЦЦІ.

ПРАЦЯГ МАЛЯЎНІЧАГА СВЯТА

РОДНІЦЬ МАСТАЦТВА

АПЛАДЫСМЕНТЫ ПАРЫЖСКАМУ СПЕВАКУ

ПЕСНЯ ДА ПЕСНІ

Гэты здымак зроблены ў Мінску, калі малады парыжскі спявак Максім лё Фарасц'е гутарыў з паўнамоцным прадстаўніком беларускай песні Уладзімірам Мулявіным. Артыстам заўсёды ёсць аб чым пагаварыць, асабліва тады, калі яны вядуць творчыя пошукі ў блізкіх напрамках — абуджаць у слухачоў роздум аб харастве і складанасці жыцця, светлы настрой упэўненасці ў заўтрашнім дні, актыўныя эмоцыі грамадзянскага напалу.

Канцэрт, які наш французскі госць даў у зале сталічнай філармоніі, акурат гэтай накіраванасцю рэпертуару і прывабіў слухачоў. І ў выканаўчай манеры Максіма лё Фарасц'е музычная культура спалучаецца з непасрэднасцю артыста; тэматыка яго песень звернута да надзённых пытанняў сучаснасці. Дарэчы, яму горача апладзіруюць на свяце газеты «Юманітэ» ў Парыжы, на якое збіраюцца тысячы прыхільнікаў камуністычнага друку.

Пасля канцэрта мы спыталі госця пра яго мінскія ўражанні.

— Мінск — другі горад Савецкага Саюза, дзе я выступаў упершыню, — сказаў Максім лё Фарасц'е. — Спачатку вельмі хваляваўся. Але потым хвіліны ўзаемнага знаёмства з публікай прайшлі, і я адчуў, што мае песні прымаюцца, іх змест і атмасфера перадаюцца ў залу. Здаецца, мы зразумелі адзін аднаго — спявак з Парыжа і моладзь беларускай сталіцы. Аб гэтым я мяркую і па тых запісках, што перадаваліся з залы на сцэну з просьбай праспяваць тую або іншую песню або паўтарыць яе на «біс». Мова сэрца, на якой і звяртаецца спявак да слухачоў, зразумелая ўсім. А такія размовы, як сяброўская гутарка, з кіраўніком вашых славутых «Песняроў» Уладзімірам Мулявіным, пакідае добры след у душы надоўга. Між іншым, «Песняроў» чакае гастрольная паездка ў Францыю, і мы рыхтуем ім гасцінную сустрэчу.

В. ХАДАСОЎСКІ.
Фота Ю. ІВАНОВА.

ВАМ, МУЗЫКАНТЫ

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна выпусціла бібліяграфічны ўказальнік «Руководителям музыкальных коллективов», складальнікам якога з'яўляецца В. Дышыневіч. Гэта выданне — своеасаблівая энцыклапедыя па розных практычных пытаннях, звязаных з работай і творчасцю музычных калектываў, народных ансамбляў, выканаўцаў, спевакоў і г. д.

Аматарам музыкі аўтар рэкамендуе сотні вучэбна-метадычных дапаможнікаў, зборнікаў п'ес, тэарэтычных даследаванняў, самавучыцеляў. Ён называе і каменціруе не толькі выданні апошніх гадоў, але і многія ранейшыя, нават з даўняга часу.

З. НАСЦЕНКА.

З прыгажосцю—у Панявежыс

У рамках Усесаюзнага фестывалю, у парадку ўзаемаабмену, Мінскі абласны краязнаўчы музей нядаўна правёў у горадзе Панявежысе Літоўскай ССР цікавую выстаўку дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, прысвечаную XXV з'езду КПСС. На гэтай выстаўцы было прадстаўлена звыш чатырохсот твораў скульптуры, разьбы па дрэву, ткацтва, вышыўкі, беларускага нацыянальнага касцюма, чаканкі па металу, вырабаў з ільну і саломкі, створаных рабочымі, калгаснікамі, служачымі, пенсіянерамі нашай вобласці.

Цікава была прадстаўлена творчасць былога партызана, цяпер рабочага з гарадскога пасёлка Крывічы Мядзельскага раёна, разьбяра па дрэву Леаніда Шостака, які экспанаваў на гэтай выстаўцы работы: «Беларускі шоўк», «Падрыўніца», «Даяркі», «Рабочы», «У мінуты адпачынку» і інш. Выступіў як сталы, удумлівы майстар скульптуры перад тысячамі панявежцаў, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, жыхар горада Вілейкі Павел Герасіменка. Увасобленыя ім у жанры скульптуры вобразы — «Дзеда Талаша», «Чырвонагвардзейца», «Матроса з Балтыкі», «Токара», «Юркі» на думку мастацтвазнаўцы Панявежскага краязнаўчага музея Ядвігі Рымшэлене, — па-сапраўднаму хвалююць, дапамагаюць больш глыбока зразумець свет савецкага чалавека.

Адзін са старэйшых і таленавітых разьбяроў па дрэву Беларусі, жыхар гарадскога пасёлка Івянец Валожынскага раёна Апалінарый Пупко, паказаў на выстаўцы паэтычныя скульптурныя партрэты: «Сымон-музыка», «Гусляр», «Пастушок» і іншыя.

За шэсцьдзесят гадоў творчай дзейнасці гэты самародак стварыў дзесяткі высокамастацкіх твораў разца і пэндзля, якія ўпрыгожваюць цяпер экспазіцыі музеяў, пастаянна дзеючых выставак самадзейнага выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Мінскай вобласці і рэспублікі.

Землякі А. Ф. Пупко — керамісты Станіслаў Адамовіч, Пётр Скрыпко, Міхаіл Звярко, Антон Пракаповіч, Баніфацый Сасноўскі, Франц Целяшэўскі і іншыя прадставілі на суд літоўскіх сяброў больш за семдзесят керамічных работ: ваз, сервізаў, графінаў, збанаў, кубкаў, жанравых кампазіцый.

Вялікае месца на выстаўцы займала самабытнае ткацтва, якое, часам, пераклікаецца арнаментальнымі і каляровымі рашэннямі, сваёй меладыкай з творамі народных умельцаў братняй Літвы. Яно было прадстаўлена ў розных матэрыялах, розных прыёмах і бытавых формах: шэрсць, лён, шоўк, муліне. Таленавітымі прадстаўнікамі гэтага жанру, якія ўдзельнічалі ў выстаўцы, з'яўляюцца калгасніцы Алена Буркун з Чэрвеньскага раёна, Праскоўя Малевіч — Мядзельскага, Вольга Дзішук — Нясвіжскага раёнаў, жыхарка горада Маладзечна Алена Шаўчувянец і іншыя.

Закрываючы выстаўку, якая дзейнічала больш чым месяц, першы намеснік старшыні выканкома Панявежскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных Эдуард Сруогюс сказаў: «У пачатку мінулага года ў Літве адбылася дэкада беларускай літаратуры і мастацтва, якая вылілася ў яркую дэманстрацыю вечнай непарушнай дружбы паміж нашымі народамі-братамі, у вялікае свята народных талентаў. Ваша выстаўка з'яўляецца нібы працягам гэтага маляўнічага свята ў нашым горадзе».

В. НОСАЎ,
дырэктар Мінскага абласнога краязнаўчага музея.

СЛОВА ТАКСАМА ВАЯВАЛА

У ліпені 1942 года група добраахвотнікаў, якую ўзначальваў стары камуніст Іван Фядотавіч Арцёменка, перайшла лінію фронту і пачала свой тысячакіламетровы шлях у грэскія лясы. Ішлі ноччу, абыходзілі населеныя пункты і нямецкія гарнізоны. У рэчавых мяшках разам з патронамі ляжалі кнігі: «Спутник партизана», «Пособие командиру и бойцу стрелкового отделения» і іншыя.

Бібліятэка ў партызанскім атрадзе імя Кірава, што дзейнічаў на Случчыне і касцяк якога складала група І. Арцёменкі, карысталася ў народных мсціўцаў асаблівай павагай. Акрамя кніг, што прынеслі яны з тылу, у бібліятэцы былі і выданні, якія дастаўлялі самалёты з «Вялікай Зямлі».

Іван Фядотавіч успамінае, што партызаны з цікавасцю чыталі «Яны змагаліся за Радзіму» М. Шолахава, «Аляксей Кулікоў, баец» Б. Гарбатава, а таксама «Слуцкі пояс» А. Астрэйкі, што выдалі народныя мсціўцы.

Партызаны клапаціліся аб папаўненні бібліятэкі. Аднойчы яны прынеслі з задання зборнік «Творчасць народаў СССР», які ў свой час выйшаў пад рэдакцыяй М. Горкага. А потым з'явіўся і «Віцязь у тыгравай шкуры» Ш. Руставелі.

Сёння кнігі з бібліятэкі атрада імя Кірава можна ўбачыць у Слуцкім гісторыка-краязнаўчым музеі.

Р. ПАСТРОН.
Слуцк.

РАЯЦЦА РЭЦЭНЗЕНТЫ

Звычайна тэатральныя крытыкі, як і крытыкі наогул, ведаюць адзін пра аднаго галоўным чынам па рэцэнзіях, змешчаных на старонках газет або часопісаў. Але вось нядаўна адбылася іх «жывая» сустрэча на творчым семінары, які працягваўся пяць дзён у Доме акцёра і быў праведзены ВТА і Саюзам журналістаў БССР. У семінары ўдзельнічалі работнікі газет, часопісаў, радыё і тэлебачання. Абмяркоўвалася тэма: «Тэатральная крытыка на старонках газет, часопісаў, на тэлебачанні і радыё».

З лекцыямі па тэарэтычных пытаннях і сучаснай сцэнічнай практыцы выступілі кандыдат філасофскіх навук Я. Бязмен, вядомы крытык А. Смялянскі і М. Швыдкой (Масква), кандыдат мастацтвазнаўства Г. Барышаў і кандыдат філалагічных навук А. Саннікаў (Мінск). Пасля адбыліся семінарскія заняткі, якімі кіравалі доктар мастацтвазнаўства А. Сабалеўскі і кандыдат мастацтвазнаўства А. Лабовіч. На іх ішла размова пра спектаклі мінскіх драматычных тэатраў «Навальніца», «Характары», «Макбет», «Чатыры кроплі» і музычную камедыю «Жаночы бунт».

Удзельнікі семінара абмеркавалі канкрэтныя праблемы рэцэнзавання твораў сцэнічнага мастацтва і асвятлення тэатральнага жыцця журналістамі рэспублікі. Было выказана пажаданне, каб такі семінар пры Беларускім тэатральным аб'яднанні быў стала дзеючым.

А. МАЦКЕВІЧ.

УРОКІ МАЛДАЎСКІХ ХАРЭОГРАФАЎ

Незвычайна багатае танцавальнае мастацтва Малдавіі набывае ўсё большую папулярнасць у нашай краіне. Новы інтарэс да малдаўскай харэаграфіі выклікаў І Усесаюзны фестываль мастацкай самадзейнасці, які праходзіць цяпер. У праграму фестывалю, акрамя аглядаў, конкурсаў, спектакляў, канцэртаў, паказу выставак, аматарскіх кінафільмаў, уваходзіць і вучоба кіраўнікоў самадзейных калектываў.

Сустрэчы кіраўнікоў харэаграфічных калектываў займаюць не апошняе месца ў планах рэспубліканскіх дамоў мастацкай самадзейнасці.

Каб зразумець цудоўнае і нялёгкае мастацтва малдаўскага танца, у Кішынёў на семінар-стажыроўку прыязджала нядаўна група кіраўнікоў народных танцавальных ансамбляў Беларускай ССР. Групу ўзначальваў загадчык аддзела харэаграфіі Рэспубліканскага Дома мастацкай самадзейнасці Г. М. Трубкін.

Заняткі семінара былі прысвечаны стылістычным асаблівасцям малдаўскіх танцаў, характэрных для розных раёнаў малдаўскай рэспублікі. Складаным рытмічным малюнкам, багатай танцавальнай лексіцы малдаўскай харэаграфіі навучалі беларускіх танцораў заслужаныя работнікі культуры МССР В. Л. Будзееў, Н. И. Лупаў, І. В. Мусцяца.

Госці з Беларусі пазнаёміліся з праграмамі малдаўскіх танцавальных калектываў — народных ансамбляў «Веселія», «Чакырлія», «Міарыца».

В. СЫНЖЭРАНУ.

ВІЗІТ У АДКАЗ

На Гродзеншчыне завяршыў гастролі фальклорны ансамбль песні і танца «Курпе Зеленэ» з Беластока. З яркім майстэрствам польскіх сяброў пазнаёміліся гледачы Гродна, Ліды, Воранава, калгасаў, «Прагрэс» і імя Варанецкага.

— Нашы гастролі — гэта візіт у адказ, — сказала намеснік загадчыка аддзела культуры Беластоцкай ваяводскай рады нарадовай Тамара Самуль. — Нядаўна да нас прыязджаў народны ансамбль песні і танца «Лідчанка» Лідскага гарадскога Дома культуры. На Гродзеншчыне мы выступалі ў пяты раз. Як і раней, нашы канцэрты былі цёпла сустрэты гледачамі.

БЕЛТА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 АТ 01047

Адрас рэдакцыі; 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-44-04, аддзела грамадска-палітычнага жыцця і інфармацыі — 33-22-04, аддзела прозы і паэзіі — 33-24-62, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-24-62 аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-21-53 аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-24-62, аддзела культуры — 33-24-62, аддзела пісем і масавай работы — 33-22-04, выдавецтва — 22-96-53, бухгалтэрыі — 23-77-65.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Хведар ЖЫЧКА.

Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Барыс БУР'ЯН, Анатоль ГРАЧАНІКАЎ, Юрый ГРЫГОР'ЕЎ, Канстанцін ГУБАРЭВІЧ, Ігар ДАБРАЛЮБАЎ, Васіль ІВАШЫН, Віктар КАВАЛЕНКА, Аляксандр КАПУСЦІН (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір НЯФЁД, Віктар ПРАТАСЕНЯ, Іраіда САНКОВА, Мікола ТКАЧОЎ, Юлія ЧУРКО, Віктар ШЫМУК (адказны сакратар), Рыгор ШЫРМА.